*2) Сістэматычная (механічная) выбарка* ўяўляе сабой працэдуру адбору кожнага N-га элемента са спісу элементаў вывучаемай сукупнасці з выкарыстаннем пэўнага «кроку», г.зн. праз пэўную колькасць нумароў, прычым нумар першага элемента выбаркі часта вызначаецца выпадковым чынам. Сістэматычны адбор з'яўляецца другім па навуковай значнасці, але першым па папулярнасці выкарыстання відам простага выпадковага адбору. У параўнанні з выпадковай выбаркай сістэматычны адбор дазваляе з большай дакладнасцю ацэньваць сярэднія значэнні доследнай сукупнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для фарміравання механічнай (сістэматычнай) выбаркі ўсе элементы генеральнай сукупнасці нумаруюцца і потым адбіраюцца, напрыклад, 1-й, 10-й, 20-й і г.д. Пры гэтым няма ніякай сістэмы ў тым, пад якім нумарам выступае той ці іншы элемент. Калі пад рукой табліцы выпадковых лікаў няма, а генсукупнасць адносна невялікая, то можна скарыстацца алфавітным спісам, напрыклад, персаналу прадпрыемства (картатэка заўсёды ёсць у аддзеле кадраў) або выбарчага ўчастка (пры апытанні па месцы жыхарства). Працэдура сістэматычнага адбору простая:

*Крок = V ген. сукупнасці / V выбаркі*

Такім чынам, крок выбаркі, а яго яшчэ называюць «інтэрвалам скачка» або проста «інтэрвалам», – гэта матэматычны паказчык, разлічаны як адносіны аб'ёму генеральнай сукупнасці да аб'ёму выбаркі. Ён паказвае, колькі нумароў у спісе прозвішчаў людзей, якія ўвайшлі ў генеральную сукупнасць, трэба прапусціць (праз колькі пераступіць), каб у выніку атрымаць спіс выбарачнай сукупнасці.

*3)* Калі генеральная сукупнасць вялікая, а такое ў эмпірычным даследаванні здараецца вельмі часта, то прыходзіцца падзяляць даследную сукупнасць на больш-менш аднастайныя часткі, а затым ажыццяўляць адбор адзінак ўнутры гэтых частак.

Калі дзяленне адбываецца па стратах (сацыяльных груп), то выбарку называюць *стратыфікаваная*, калі па эканоміка-геаграфічным раёнах, то – *раянаваная*. Асноўная мэта усякага расслаення – павышэнне дакладнасці выбарачных ацэнак.

*4)* Супрацьлегласць раянаванай і стратыфікаванай выбарцы – *гнездавая выбарка*. Сутнасць гнездавой (серыйнай) выбаркі заключаецца ў тым, што адбіраюцца не адзінкі генеральнай сукупнасці, а цэлыя іх групы (“гнёзды”), унутры якіх вывучаюцца ўсе элементы, г.зн. праводзіцца суцэльнае даследаванне.

Гняздом называюць адзінку адбору вышэйшай ступені, якая складаецца з больш дробных адзінак ніжэйшай ступені. У выбарку могуць быць уключаны як усе адзінкі ніжэйшага ўзроўню, так і іх частка. Колькасць адзінак, якія ўтвараюць гняздо, называюць яго памерам. У якасці гнёздаў выступаюць населеныя пункты, раёны, дома, пад'езды, прадпрыемствы, аддзелы.

Гнездавой адбор мае вялікія арганізацыйныя перавагі – прасцей ажыццяўляць адбор і абследаванне некалькіх кампактных груп, чым дзясяткаў ці сотняў асобных адзінак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры гнездавой выбарцы вызначаюцца групы або гнёзды элементаў і складаюцца іх спісы. Затым з гэтага спісу адзінак выбаркі праектуецца выбарка. Потым толькі для гэтых адзінак ідэнтыфікуюцца і адбіраюцца элементы. Патрабаванні да гнездавой выбарцы – адбор гнёздаў у адпаведнасці з патрабаваннямі **мінімальных адрозненняў паміж імі** і **максімальнай неаднастайнасці іх адзінак**.

Нараўне з імавернаснымі, на практыцы часта выкарыстоўваюць мэтанакіраваныя выбаркі.

**Метады неімавернаснай (мэтанакіраванай) выбаркі**

Невыпадковая (неімавернасная) выбарка – гэта спосаб адбору адзінак, пры якім мы не можам загадзя разлічыць верагоднасць траплення кожнага элемента ў склад выбарачнай сукупнасці, што, зразумела, не дае магчымасці разлічыць, наколькі правільная (рэпрэзентатыўная) выбарка. Па гэтай прычыне перавага звычайна аддаецца імавернаснай выбарцы, аднак часам па ўмовах даследавання аказваецца адзіна магчымым правесці невыпадковую выбарку.

Але можна сказаць, што па змястоўным крытэрам неімавернасная (мэтанакіраваная) выбарка не горш за імавернасную, а можа быць, і лепш. Яе недахопы: немагчымасць устанавіць ступень рэпрэзентатыўнасці і больш высокі кошт (з пункту гледжання затрат яна звычайна пераўзыходзіць імавернасную на некалькі парадкаў). Але ёсць і перавагі – больш глыбокае, якаснае і ўсебаковае раскрыццё прадмета ў параўнанні з імавернаснай.

*1) Метад тыповых прадстаўнікоў* часта аказваецца зручным на вышэйшых ступенях адбору, калі неабходна абмежавацца невялікай колькасцю аб'ектаў. Адбор тыповых аб'ектаў можа ў дастатковай меры забяспечыць рэпрэзентатыўнасць атрыманых даных толькі ў тым выпадку, калі прыняты меры па абгрунтаванні выбару аб'ектаў. Для гэтага неабходна мець дадатковую інфармацыю па шэрагу прыкмет, якія могуць разглядацца ў якасці кантрольных.

*2) Метад «снежнага камяка»* (snowball sampling) – разнавіднасць мэтанакіраванага выбару, пры якім адбор дадатковых (наступных) рэспандэнтаў вырабляецца пасля спасылкі на іх першапачаткова адабраных. Такая працэдура выкарыстоўваецца пры вывучэнні асаблівых, рэдкіх, невыпадковых сукупнасцей.

Гэты метад звычайна ўжываецца для адбору экспертаў і рэдка сустракаемых груп рэспандэнтаў (так званых рэдкіх элементаў) – напрыклад, карыстальнікаў з вельмі высокімі даходамі ці прадстаўнікоў элітных груп. Па сутнасці, гэта тэхніка пошуку і адбору рэспандэнтаў з вызначаным



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спалучэннем уласцівасцяў у такіх умовах, калі цяжка акрэсліць межы генеральнай сукупнасці. Асаблівасць метаду заключаецца ў тым, што, за выключэннем першага кроку, выбар кожнага чарговага рэспандэнта здзяйсняецца па ўказанні рэспандэнтаў, уключаных у выбарку на папярэднім кроку. Кожны рэспандэнт паказвае інтэрв'юеру, дзе можна знайсці людзей, якія яго цікавяць (і нават сам звязваецца з імі і рэкамендуе інтэрв'юера), і выбарка з кожным крокам разрастаецца, падобна снежнаму каму.

3) *Метад стыхійнага адбору* толькі вонкава падобны на выпадковы адбор, паколькі сацыёлаг, прыблізна ведаючы, каго яму трэба апытаць, ідзе на вуліцу ці спыняецца ля станцыі метро, апытваючы ўсіх, каго атрымаецца, ці хто падобны на прадстаўнікоў генеральнай сукупнасці, напрыклад, людзей ва ўзросце ад 30 да 40 гадоў. Ніякіх матэматычных працэдур пры складанні выбаркі тут не ўжываецца, і выканаць кантроль за забеспячэннем рэпрэзентатыўнасці немагчыма. Часцей за ўсё фіксуецца меркаванне тых, хто мае магчымасць і жаданне пагаварыць з інтэрв'юерам. Стыхійны адбор можа прымаць іншую форму, калі не сацыёлаг падыходзіць да першага сустрэчнага на вуліцы, а першы сустрэчны адказвае даследчыку па сетцы Інтэрнэт, адгукаючыся на зварот прыняць удзел у сеткавым апытанні.

Стыхійныя выбаркі фармуюцца адвольна і часта незалежна ад самога даследчыка. Прыкладамі стыхійнага адбору могуць служыць апытанні з дапамогай сацыяльных медыя, выбарка «першага сустрэчнага», апытанні пакупнікоў у залах супермаркетаў, пасажыраў на прыпынках і ў грамадскім транспарце.

4) Да стыхійнаму адбору цесна прымыкае *метад асноўнага масіва.* Метад асноўнага масіва ўяўляе сабой апытанне 60-70% ад генеральнай сукупнасці. Працэдура яго вельмі простая: з жыхароў дадзенага раёна або работнікаў прадпрыемства апытваецца простая большасць. У выніку сярэднія генеральнай і выбарачнай сукупнасцей збліжаюцца, а выбарачная сукупнасць складае пераважную частку генеральнай і перакрывае магчымае зрушэнне.

5) *Квотная выбарка* – мікрамадэль аб'екта сацыялагічнага даследавання, якая фарміруецца на аснове статыстычных звестак (параметраў квот) пераважна аб сацыяльна-дэмаграфічных характарыстыках элементаў генеральнай сукупнасці. Патрэбныя даныя звычайна бяруць з статыстычных даведнікаў і баз даных.

Квотны метад выбаркі патрабуе папярэднюю наяўнасць статыстычных звестак па шэрагу істотных характарыстык генеральнай сукупнасці. Удзельная вага квоты ў выбарачнай сукупнасці павіннна адпавядаць яе ўдзельнай вазе ў генеральнай сукупнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звычайна квотная выбарка выкарыстоўваецца на апошніх ступенях адбору і завяршае працэс раянавання (стратыфікавання) і прымянення імавернасных працэдур. Тэхналогія: па статыстычных даных даследуецца структура генеральнай сукупнасці, вылічваецца доля ў працэнтах для кожнай структурнай адзінкі (напрыклад, узрост, пол, адукацыя, пасада). Адсоткавыя суадносіны пераносіцца на выбарачную сукупнасць.

Адзначым, што ў рэальнай практыцы часцей за ўсё ўжываецца *шматступенная выбарка*, пабудаваная з прымяненнем працэдуры паэтапнага адбору аб'ектаў апытання. Пры гэтым сукупнасць аб'ектаў, адабраных на папярэднім этапе (ступені) становіцца зыходнай для адбору на наступным. Адпаведна адрозніваюць адзінкі адбору першай ступені (першасныя адзінкі), адзінкі адбору другой ступені (другасныя адзінкі) і г.д. Аб'екты самай ніжняй ступені, з якіх вядзецца непасрэдны збор інфармацыі, называюцца адзінкамі назірання.

Да шматступеннага адбору звяртаюцца ў тых выпадках, калі генеральная сукупнасць мае настолькі вялікі аб'ём, што просты выпадковы або сістэматычны адбор элементаў прывёў бы да празмернага распылення выбаркі па ўсёй тэрыторыі. Папросту кажучы, такі метад ужываюць у тых выпадках, калі вывучаюць досыць вялікія групы людзей.

Перавага прымянення шматступеннай выбаркі заключаецца ў тым, што павелічэнне колькасці ступеняў прыводзіць да скарачэння базавых кропак апытання і, такім чынам, да эканоміі матэрыяльных і людскіх рэсурсаў, якія ўключаюцца ў працэс даследавання. Тут жа праяўляецца і слабы бок гэтага метаду – зніжэнне дакладнасці выбарачных ацэнак. У працэсе ажыццяўлення шматступеннага сацыялагічнага даследавання можа прымяняцца не толькі шматступенная выбарка, але і іншыя тыпы выбарак, напрыклад, метад адбору тыповых прадстаўнікоў на першай ступені або квотны адбор рэспандэнтаў на апошняй ступені.

Злучэнне ў шматступеннай выбарцы розных прыёмаў адбору (выпадковага, сістэматычнага, кластэрнага і інш.) робіць выбарку фактычна камбінаванай. Паколькі большасць даследуемых у сучасных сацыялагічных НДР генеральных сукупнасцей (напрыклад, насельніцтва краіны або рэгіёну) з'яўляюцца сацыяльна неаднародным і, такім чынам, патрабуюць папярэдняга стратыфікавання, раянавання, а нярэдка і кватавання альбо кластэрнага аналізу, пастолькі большасць выкарыстоўваемых сацыёлагамі выбарак з'яўляюцца *камбінаванымі*.

Адхіленне статыстычнай структуры выбаркі ад структуры генеральнай сукупнасці называецца памылкай выбаркі. Да **выпадковых памылак**



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адносяцца статыстычныя хібнасці, арганічна ўласцівыя выбарчаму метаду, і памылкі, выкліканыя выпадковымі парушэннямі ў працэдурах збору інфармацыі.

**Сістэматычныя памылкі** выклікаюцца прычынамі, якія носяць невыпадковы характар і прыводзяць да **рэзкага скажэння характарыстык** генеральнай сукупнасці. Яны ўзнікаюць, калі, напрыклад: 1) выбарка не адпавядае задачам даследавання (сацыёлаг вырашыў вывучыць толькі працуючых пенсіянераў, а апытаў усіх запар); 2) у няведанні характару генеральнай сукупнасці (сацыёлаг думаў, што 70% усіх пенсіянераў не працуе, а аказалася, што не працуе толькі 10%); 3) адбіраюцца толькі «выйгрышныя» элементы генеральнай сукупнасці (напрыклад, толькі забяспечаныя пенсіянеры).

У адрозненне ад выпадковых памылак сістэматычныя памылкі пры ўзрастанні аб'ёму выбаркі не памяншаюцца.

Абагульніўшы ўсе выпадкі, калі адбываюцца сістэматычныя памылкі, метадысты склалі іх рэестр:

♦ парушаны метадычныя і метадалагічныя правілы правядзення сацыялагічнага даследавання;

♦ выбраны неадэкватныя спосабы фарміравання выбарачнай сукупнасці, метады збору і разліку даных;

♦ адбылася замена патрэбных адзінак назірання іншымі, больш даступнымі;

♦ адзначаны няпоўны ахоп выбарачнай сукупнасці (недаатрыманне анкет, няпоўнае іх запаўненне, цяжкадаступнасць адзінак назірання).

Вось некаторыя спосабы пазбегнуць памылак: а) кожная адзінка генеральнай сукупнасці павінна мець аднолькавую верагоднасць патрапіць у выбарку; б) адбор пажадана ажыццяўляць з аднастайных сукупнасцей; в) трэба ведаць характарыстыкі генеральнай сукупнасці; г) пры складанні выбарачнай сукупнасці трэба ўлічваць выпадковыя і сістэматычныя памылкі.

**Падрыхтоўка праекта выбаркі:**

1. Які эмпірычны аб'ект даследавання?
2. Ці з'яўляецца даследаванне суцэльным або выбарачным?
3. Калі яно з'яўляецца выбарачным, ці прэтэндуе яно на рэпрэзентатыўнасць?
4. Калі яно прэтэндуе на рэпрэзентатыўнасць, то якая генеральная сукупнасць?
5. Колькі ступеняў адбору ўжываецца ў выбарцы?
6. Якая адзінка адбору на кожнай ступені?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Якая стратэгія адбору выкарыстоўваецца на кожнай ступені (выпадковая, квотная, інш.)?
8. Якая канкрэтна разнавіднасць выпадковага адбору выкарыстоўваецца?
9. Якія параметры выкарыстоўваюцца пры квотнай выбарцы?
10. Што з'яўляецца асновай выбаркі (спіс, картатэка, БД)?
11. Якая адзінка назірання на апошняй ступені адбору?

### *Тэма 5. Вымярэнне сацыялагічных характарыстык аб’екта*

**Вымярэннем** (у шырокім сэнсе) у сацыялагічнай навуцы можна назваць любое сацыялагічнае даследаванне, бо яго задачай з'яўляецца адбор, вывучэнне, прадстаўленне сацыяльных фактаў, з'яў, працэсаў, іх найбольш дакладнае апісанне з выкарыстаннем матэматычнага апарата.

Вымярэнне часам называюць квантыфікацыяй. **Квантыфікацыя** – гэта колькаснае прадстаўленне інфармацыі аб уласцівасцях аб'екта, г.зн. атрыманне лікаў, якія характарызуюць сацыяльны працэс, сацыяльную з'яву ці сацыяльную сістэму. Квантыфікацыя азначае выбар паказчыкаў для даследавання і ацэнкі сацыяльных з'яў. Гэта дасягаецца шляхам простых падлікаў першасных паказчыкаў або выкарыстання розных працэдур вымярэння.

Вымярэнне азначае, якім чынам, з дапамогай якіх сродкаў і ў якой форме даследчык можа атрымаць неабходную інфармацыю.

Сучасныя даследчыкі разумеюць вымярэнне як прыпісванне аб'ектам, іх прыкметам лікавых значэнняў у выглядзе эмпірычных індыкатараў і матэматычных знакаў. З яго дапамогай даецца колькасная і якасная ацэнка ўласцівасцяў, прыкмет аб'екта. Яно можа быць разгледжана як пабудова матэматычнай мадэлі пэўнай эмпірычнай сістэмы.

Любое вымярэнне вядзецца з захаваннем працэдур. Працэдура – гэта пэўная паслядоўнасць дзеянняў, якія ажыццяўляюцца ў працэсе сацыялагічнага вымярэння для таго, каб ахарактарызаваць сацыяльныя ўласцівасці аб'екта.

**Вымяральная працэдура** складаецца з такіх асноўных дзеянняў як:

1. Тэарэтычная аперацыяналізацыя паняццяў.
2. Фарміраванне эмпірычных індыкатараў.
3. Шкаліраванне.
4. Аналіз даных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На першай стадыі неабходна вызначыць, што мы вымяраем і што ўкладваем у вымяраемую ўласцівасць аб'екта, адлюстраваную ў паняцці. Напрыклад, паняцці статус, задаволенасць, сацыяльны стрэс, дыскамфорт і г.д. Такая працэдура называецца тэарэтычнай аперацыяналізацыяй. Тэарэтычныя пераменныя не маюць нейкага абсалютнага раз і назаўсёды вызначанага значэння. Іх значэнне часцей за ўсё залежыць ад кантэксту ўжывання, канцэптуальнай схемы, якую мы выкарыстоўваем.

Наступны этап – гэта фарміраванне эмпірычных індыкатараў, г.зн. пераменных. Індыкатары – колькасныя характарыстыкі сацыяльных з'яў, якія выкарыстоўваюцца для сацыялагічнага вымярэння. У якасці індыкатараў выбіраюць як аб'ектыўныя характарыстыкі сацыяльных з'яў, так і суб'ектыўныя.

Напрыклад, для паняцця «адукацыя» аб'ектыўным індыкатарам можа быць «узровень адукацыі», паказчыкамі якога з'яўляюцца: пачатковая, няпоўная сярэдняя, агульная сярэдняя, пачатковая прафесійная, сярэдняя прафесійная і вышэйшая адукацыя. Гэтыя аб'ектыўныя паказчыкі і становяцца пазіцыямі шкалы вымярэння.

Да ліку суб'ектыўных індыкатараў адносяцца ўстаноўкі, ацэнкі і меркаванні людзей, якія адлюстроўваюць іх стаўленне да розных сацыяльных з'яў і працэсаў.

Напрыклад, «задаволенасць працай на пасадзе» можа быць вымераная з дапамогай суб'ектыўнага індыкатара «ступень задаволенасці», паказчыкамі якога з'яўляюцца «цалкам задаволены», «часткова задаволены» і «не задаволены».

Важным інструментам вымярэння выступаюць у сацыялогіі вымяральныя шкалы. **Вымяральная шкала** – асноўны інструмент сацыяльнага вымярэння, у якасці эталона служыць сродкам фіксацыі той ці іншай сукупнасці значэнняў, якія цікавяць даследчыка. Шкала ўсталёўвае пэўную паслядоўнасць індыкатараў.

Працэдура вымярэння сацыяльных характарыстык з дапамогай шкалы называецца **шкаліраваннем**.

Шкала – нейкая сістэма паказчыкаў, прысвоймаемых вывучаемаму аб'екту, г.зн. гэта пераменная з варыянтамі адказаў. Паказчыкі ў шкалах называюць шкальнымі значэннямі або сукупнасцю шкальных значэнняў. Сукупнасць шкальных значэнняў у агульным выглядзе ўяўляе сабой пэўную мадэль сацыяльнай рэальнасці і ўтварае аднамерны кантынуўм.

**Кантынуўм** – гэта **працягласць** вывучаемай уласцівасці аб’екта з указаннем яго крайніх значэнняў. Тэрмін кантынуум азначае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бесперапыннасць. Ён можа быць прадстаўлены ў выглядзе бесперапыннай лініі (восі), на якой размешчаны аб'екты вымярэння з зададзенымі (прыпісанымі) ім лікамі.

У залежнасці ад характару вымяраемых прыкмет і задач іх аналізу выкарыстоўваюцца розныя шкалы: намінальная (для класіфікацыі аб'ектаў, іх прыкмет), парадкавая (для параўнання інтэнсіўнасці праявы прыкметы па ўзрастанні і змяншэнні), інтэрвальная (для аналізу інтэнсіўнасці ўласцівасцяў аб'ектаў, выяўленых велічынямі, разбітымі на роўныя інтэрвалы), шкала адносін (для адлюстравання адносін прапорцыі). Вядомы шкалы, якія ўвайшлі ў сацыялогію пад імем іх стваральнікаў (Багардуса, Тэрстоўна, Гутмана і інш.). Шкалы адрозніваюцца таксама па колькасці пазіцый у шкале: трохчленныя і пяцічленныя. Напрыклад, шкала задаволенасці работай можа выглядаць так:

1) задаволены
2) прамежкавая пазіцыя
3) незадаволены

або

1) цалкам задаволены
2) хутчэй задаволены, чым не задаволены
3) прамежкавая пазіцыя
4) хутчэй не задаволены, чым задаволены
5) зусім не задаволены

**Намінальная шкала** – шкала найменняў. Дадзены від шкалы адлюстроўвае прамыя ўласцівасці аб'екта, якія маюць аб'ектыўны характар: пол, узрост, нацыянальнасць, адукацыя, род заняткаў, пасада, месца пражывання, належнасць да палітычных партыяў і да т.п.

Такая шкала нічога не вымярае, а толькі паказвае ўласцівасці аб'екта. Напрыклад:

- спецыяліст нізкай кваліфікацыі;
- спецыяліст сярэдняй кваліфікацыі;
- спецыяліст высокай кваліфікацыі.

З дапамогай намінальнай шкалы можна зафіксаваць меркаванне рэспандэнта аб чым-небудзь, яго ўстаноўку, матыў. Дадзены від шкалы адносіцца да найбольш простых тыпаў шкал, бо прадугледжвае просты варыянт адказу “так” або “не” ці выбар з названых варыянтаў адказаў.

У працэсе вымярэння намінальная шкала дазваляе ўстанаўліваць адрозненні, суадносіны роўнасці, няроўнасці паміж аб'ектамі даследавання. Адзначаныя рэспандэнтамі значэнні пераменных могуць паказваць іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аднолькавыя або розныя пасады, прафесіі і іншыя ўласцівасці. Пры намінальным вымярэнні аб'екты можна аднесці ў пэўныя класы, групы па якіх-небудзь прыкметах. Намінальныя шкалы могуць быць у выглядзе неўпарадкаванай шкалы або часткова ўпарадкаванай. Цалкам упарадкаваная шкала называецца парадкавай або рангавай.

**Парадкавая (ранговая) шкала** – гэта цалкам упарадкаваная шкала, у якой значэння пераменных дадзены ў пэўнай паслядоўнасці, у пэўным парадку (рангу), часцей – ад больш важнага значэння да менш значнага, у якіх выражаецца стаўленне рэспандэнта да чаго-небудзь, каго-небудзь. Такая шкала ўпарадкавае аб'екты па ступені выяўленасці іх уласцівасцяў, прыкмет ў рамках адносін «больш-менш», прадстаўляючы тым самым пэўную іерархію гэтых прыкмет, уласцівасцяў і параўнанняў.

Такая шкала часцей за ўсё вымярае ступень згоды са сцвярджэннем або ўзровень задавальненя чым-небудзь, кім-небудзь. Варыянты адказаў ідуць ад максімальна станоўчага да адмоўнага ці наадварот.

Напрыклад, на пытанне "Ці задаволеныя Вы сваёй вучобай?" адказы могуць быць размешчаны ў такой паслядоўнасці:

1) цалкам задаволены;
2) задаволены;
3) хутчэй задаволены, чым незадаволены;
4) не магу адказаць;
5) хутчэй незадаволены, чым задаволены;
6) незадаволены;
7) цалкам незадаволены.

У некаторых выпадках парадкавую шкалу называюць **рангавай шкалой**: рэспандэнту прапануюць шэраг пералічаных меркаванняў размясціць у парадку яго пераваг ад першага да апошняга або паказаць лічбамі (прыпісаць патрэбны ранг – лік значэнню пераменнай). Напрыклад, размясціць якасці сучаснага лідэра ў парадку іх важнасці для рэспандэнта. Шкала пры гэтым можа быць прамой – ад 1 да 5 або перавернутай – ад 5 да 1, паказваючы ступень узрастання значэння. Іншымі словамі, тут ужо ёсць нейкая лінейка для вымярэння рэспандэнтам уласцівасцяў аб'екта. Такая шкала будзе насіць ацэначны характар.

Такі тып шкал ўжываецца часцей за ўсё, бо яны даюць каштоўную інфармацыю, дазваляюць вызначыць якасныя бакі аб'екта вывучэння, яго стан. Звесткі, атрыманыя з дапамогай такой шкалы, можна карэляваць (вызначаць залежнасці) з узроўнем адукацыі, кваліфікацыі, родам заняткаў і г.д. А на базе гэтых даных можна будаваць больш складаныя, г.зн.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шматмерныя, камбінаваныя шкалы. Узровень вымярэння такой шкалой вышэй, чым звычайнай намінальнай.

**Інтэрвальныя шкала** – гэта шкала, у якой значэнні дадзены ў пэўных межах (інтэрвалах) і выражаны ў ліках. Напрыклад, пры вызначэнні ўзроўню даходаў, ўзросту, працоўнага стажу, перыядычнасці якіх-небудзь дзеянняў. У дадзеным тыпе шкалы выкарыстоўваецца лічбавая сістэма вымярэння ў пэўных інтэрвалах, г.зн. тут прысутнічае адзінка вымярэння.

Напрыклад:

Ўзрост, гады:

15-19

20-24

25-29

30-34

35-39

40-45 і г.д.

Інтэрвальныя шкалы могуць быць роўнымі і няроўнымі, г.зн. інтэрвалы па велічыні роўныя паміж сабой або розныя. Інтэрвалы можна павялічыць або паменшыць. Інтэрвальныя шкала дазваляе адлюстраваць адлегласць паміж шкаліруемымі аб'ектамі. Гэта робіць вымярэнне больш дакладным. Асноўная цяжкасць у пабудове гэтых шкал – абгрунтаванне роўнасці або рознасці дыстанцый паміж пунктамі (інтэрвалу).

З дапамогай інтэрвальнай шкалы мы можам устанаўліваць адносіны роўнасці не паміж самімі аб'ектамі, а паміж інтэрваламі лікавай шкалы: роўныя рознасці лікаў адпаведаюць роўным рознасцям значэнняў вымяранай уласцівасці або прыкметы.

Калі ў інтэрвальнай шкале зададзены роўныя інтэрвалы і адлік вядзецца ад нулявой адзнакі, то такую шкалу называюць **шкалой прапарцыйных ацэнак**. Падобныя шкалы часцей прымяняюцца ў дакладных навуках, у псіхалогіі, дзе патрабуецца вымераць пэўныя фізіялагічныя і псіхалагічныя ўласцівасці чалавека.

**Метрычная шкала** – гэта шкала, якая прадстаўляе вылічэнне эмпірычнага паказчыка ў абсалютных ліках. Яна паказвае лінейнае размяшчэнне даных, г.зн. лінейку, на якой можна адлюстраваць даныя, якія характарызуюць непосрэдныя ўласцівасці аб'екта (колькі гадоў, велічыня часу, сродкаў, аб'ёму і да т.п.). Такім чынам прадстаўляюць некаторыя колькасныя даныя аб дзейнасці рэспандэнтаў.

Інтэрвальныя, метрычныя шкалы называюць шкаламі больш высокага тыпу, колькаснымі, лікавымі, бо сацыёлаг у дадзеным выпадку мае справу з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лікамі і ў яго ёсць магчымасць падвяргаць іх розным пераўтварэнням, аналізу (карэляцыйнаму, рэгрэсіённаму і інш.), рабіць пэўныя вылічэнні.

У гэтых шкалах можна разлічваць сярэднеўзважаныя велічыні, каэфіцыент дысперсіі (ступень раскіданасці прыкметы), вылічваць індэксы.

Намінальныя і парадкавыя шкалы называюць шкаламі нізкага тыпу, якаснымі, нялічбавымі.

Парадкавыя, ранговыя, інтэрвальныя шкалы часам называюць **шкаламі адносін**, бо ў іх з дапамогай лікаў выражаецца стаўленне рэспандэнта да чаго-небудзь, каго-небудзь. У намінальных шкалах гэтага няма.

Існуюць **ацэначныя шкалы** – гэта такія шкалы, у якіх рэспандэнты з дапамогай лікаў вымяраюць аб'екты (меркаваньні, каштоўнасці, з'явы, праблемы). Тут лічбы прыпісваюцца аб’ектам, іх уласцівасцям. Напрыклад, ацэньваецца ўзровень даверу да ўлады, якасць абслугоўвання, рэсурса і г.д. Затым па гэтых даных вылічваецца ўсярэдненая велічыня, якая адлюстроўвае меркаванне ўсіх рэспандэнтаў.

Тыпы шкал адлюстроўваюць пэўны ўзровень вымярэння: намінальны, парадкавы, інтэрвальны, абсалютны (метрычны).

Можна таксама выкарыстоўваць **графічны тып шкаліравання**.

Напрыклад, задаволенасць вучобай рэспандэнт можа паказать на лінейнай шкале, адзначыць значэнне, выбраўшы паказчык на лініі:

-3 -2 -1 0 +1 +2 +3

**Шкалы ўстановак**. Устаноўка – гэта агульная арыентацыя суб'екта на пэўны тып паводзінаў, схільнасць да якога-небудзь тыпу дзеяння.

Устаноўка адлюстроўвае каштоўнаснае стаўленне рэспандэнта да аб'екту, псіхалагічна выказанае ў яго гатоўнасці станоўчай або адмоўнай рэакцыі на яго. Устаноўка паказвае палучэнне пазітыўных і негатыўных пачуццяў рэспандэнта па адносінах да аб'екта. Выбар рэспандэнтам таго ці іншага меркавання будзе сведчыць аб ступені выяўленасці яго эмацыянальных адносінаў да прадмета ўстаноўкі.

Выкарыстанне ўстановачных шкал адрозніваецца тым, што лічба прыпісваецца самім рэспандэнтам, а не аб'ектам, якія ацэньваюцца.

Такі шкалой ўжо нельга мераць ўзрост, пол рэспандэнта. Гэтыя шкалы досыць рэдка ўжываюць у сацыялогіі, нашмат часцей у псіхалогіі.

Вядомыя тры асноўных шкалы установак:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шкала Тэрстоўна, вядомая як метад роўных (ці суб'ектыўна роўных) інтэрвалаў.

Шкала Лейкерта, або метад сумарных адзнак.

Шкала Гутмана, або шкалаграмны аналіз Гутмана.

Шкалы павінны адпавядаць такім патрабаванням, як:

**Валіднасьць** – гэта ступень адпаведнасці шкалы таму, што неабходна вымераць, адпаведнасць выбраных індыкатараў вывучаемым уласцівасцям і якасцям. Валіднасць азначае, ці гэтым паказчыкам трэба вымяраць прадмет даследавання. Ацэнка паказчыка, пошук адэкватнасці вымяральніка вывучаемай уласцівасці аб’екта называецца валідызацыяй.

**Паўната** азначае ўлік усіх значэнняў індыкатара. Яна праўляецца як варыябельнасць значэнняў у пераменнай, іх дастатковасць для атрымання неабходнай інфармацыі, г.зн. іх колькасць павінна быць поўнай для высвятлення сутнасці пытання. Напрыклад, жадаючы высветліць формы правядзення вольнага часу, можна паказаць толькі найбольш вядомыя – вучоба, актыўны адпачынак, творчасць, а можна з больш падрабязным пералікам гэтых формаў – формы вучобы, віды актыўнага адпачынку, формы творчасці і інш.

**Адчувальнасць** – гэта здольнасць шкалы паказваць стаўленне рэспандэнтаў да чаго-небудзь, да каго-небудзь. Яна патрабуе наяўнасць дастатковай колькасці пазіцый у шкале для вымярэння ўласцівасцяў. У ёй адлюстроўваюцца суб'ектыўныя ацэнкі рэспандэнта. Таму чым больш варыянтаў ацэнак, тым больш адчувальнай з'яўляецца шкала. Практыка паказвае, што аптымальная колькасць ацэнак: тры-пяць. Дадзеныя ацэнкі павінны быць сіметрычнымі, г.зн. колькасць пазіцый станоўчых і адмоўных ацэнак павінна быць роўнай. Напрыклад, на пытанне: “Ці задаволены Вы сваёй вучобай?”, можна даць наступныя варыянты: задаволены, цяжка адказаць, не задаволены. Або больш поўны пералік варыянтаў: задаволены, з большага задаволены, хутчэй незадаволены, незадаволены, цяжка адказаць.

**Рэлевантнасць** – сэнсавая адпаведнасць паміж інфармацыйны запытам і атрыманым паведамленнем.

**Дакладнасць шкалы** – ступень супадзення атрыманай з дапамогай дадзенай шкалы інфармацыі з сапраўднай велічынёй вывучаемай уласцівасці.

**Надзейнасць шкалы** – гэта ўстойлівасць паказчыкаў уласцівасцяў аб'екта даследавання пры паўторным выкарыстанні дадзенай шкалы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Тэма 6. Класіфікацыя метадаў збора сацыялагічнай інфармацыі і асаблівасці іх вакарыстання ў бібліятэказнаўстве***

Суіснаванне ў сацыялогіі колькаснай і якаснай стратэгій даследавання абумоўлівае і наяўнасць адпаведных падыходаў да выбару метадаў.

У колькаснай метадалогіі выкарыстоўваюць тры асноўныя метады збору першасных эмпірычных даных: **непасрэднае назіранне, аналіз дакументаў і апытанне**. Паслядоўнасць выкарыстання гэтых метадаў у асобным даследаванні або падставы для пераважнага выкарыстання аднаго з іх вызначаюцца зместам і задачамі даследавання і не маюць вырашальнага значэння.

Бібліятэчная справа – адна з тых галін дзейнасці, дзе традыцыйна добра наладжаны механізм збору статыстычнай інфармацыі. Бібліятэчная статыстыка заўсёды лічылася найбольш прадстаўнічай статыстыкай у сферы культуры. Таму развіццё бібліятэчнай сацыялогіі адбывалася пад знакам «адштурхвання» ад існаваўшай сістэмы галіновай статыстыкі, імкнення атрымаць інфармацыю, якая гэтай сістэмай не выяўляецца (“Статыстыка адлюстроўвае дзейнасць устаноў, а сацыялогія – паводзіны людзей”).

Развіццё методыкі і тэхнікі правядзення сацыялагічных апытанняў – лішні довад на карысць таго, што апытанне працягвае заставацца незаменнай крыніцай атрымання інфармацыі аб суб'ектыўным свеце людзей, іх схільнасцях, матывах, каштоўнасцях і інш. Унікальнасць апытанняў як метадаў атрымання інфармацыі грунтуецца на наступных важных уласцівасцях:

• апытанне дазваляе выявіць суб'ектыўны стан чалавека, які можа і не праявіцца ў назіраных паводзінах, але быць крыніцай матываў паводзін і дзеянняў;

• апытанне дае магчымасць мадэляваць сітуацыі, якія дазваляюць ацэньваць устойлівасць матываў, намераў, патрэбаў і іншых суб'ектыўных станаў;

• апытанне – амаль універсальны метад, які дазваляе (пры выкананні адпаведных патрабаванняў) атрымаць інфармацыю пра што заўгодна (мінулым, сучаснасці, будучыні, аб самім рэспандэнце і іншых людзях, аб легальнымі ценявым, нармальных і дэвіянтных паводзінаў і г.д.).

Існуюць дзве вялікія групы апытальных метадаў: **анкетныя апытанні і інтэрв'ю**. Прыхільнікі колькасных метадаў лічаць магчымым выкарыстанне тых і іншых відаў апытанняў у рамках канкрэтнай даследчай праграмы. Прыхільнікі якасных метадаў жорстка крытыкуюць анкетныя апытанні і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прызнаюць толькі выкарыстанне метадаў інтэрв'ю, вусных гісторый, біяграфій. Калі ў якасці крытэрыя ісціны ў метадычнай сферы прыняць праблему надзейнасці інфармацыі, якую атрымліваюць тым ці іншым спосабам, становіцца відавочным, што большасць праблем, звязаных з надзейнасцю інфармацыі, аказваюцца для іх агульнымі.

Таму пры выбары метадаў збору інфармацыі неабходна кіравацца зместам, мэтамі і задачамі даследавання, звязанымі з сацыяльнымі функцыямі бібліятэкі. Да таго ж і колькасныя, і якасныя даследаванні любога віду (**кейс-стады, этнаграфічныя, гістарычныя, гісторыі сям'і, групавыя дыскусіі**) не з'яўляюцца непасрэднай мэтай бібліятэчнай сацыялогіі, а іх вынікі цікавяць бібліятэчную сацыялогію толькі ў адной якасці, а менавіта ў тым, як яны выражаны (сфакусаваны) ў матывацыі звароту чалавека да інфармацыйных, адукацыйных, культурных функцый бібліятэкі. Праблемы тыпалагізацыі чалавечых паводзінаў і, галоўнае, надзейнасці даных у іх настолькі вострыя, што статыстычна абгрунтаваных даных у гэтых даследаваннях быць не можа (Г. Л. Васільеў), чым і тлумачацца іх выключна дапаможныя функцыі ў бібліятэчнай сацыялогіі.

На пачатковай стадыі сацыялагічнага даследавання сацыёлаг хутчэй за ўсё, скарыстаецца метадам аналізу дакументаў і назірання, а затым на стадыі апытання будзе камбінаваць анкетнае апытанне: разнастайныя формы інтэрв'ю (з чытачамі, экспертамі, свабодныя, напаўстандартызаваныя, фармалізаваныя, індывідуальныя, групавыя і інш.), кожная з якіх мае свае станоўчыя якасці і недахопы.

Так, **свабоднае інтэрв'ю** – гэта доўгая гутарка без дэталізацыі пытанняў, але па загадзя прадуманай праграме, а **фармалізаванае інтэрв'ю** патрабуе дэталёвую праграму гутаркі, складанне плана, распрацоўку паслядоўнасці і зместу пытанняў, а часам варыянтаў адказаў. **Напаўстандартызаванае інтэрв'ю** – нешта сярэдняе паміж свабодным і фармалізаваным.

Паказальна паступовае пашырэнне ролі **экспертных апытанняў**. Традыцыйна лічыцца, што роля экспертаў можа быць звязана толькі сферай прафесійнай кампетэнцыі. Таму, напрыклад, бацькі не могуць быць экспертамі ў пытаннях дзіцячага чытання, бо не маюць прафесійнай (педагагічнай або бібліятэчнай) падрыхтоўкі. У бібліятэчнай сферы экспертныя апытанні практычна заўсёды ўяўлялі сабой апытанне бібліятэчных работнікаў (або бібліятэказнаўцаў) па тых ці іншых праблемах бібліятэчнай справы. Апытанні ж карыстальнікаў бібліятэк заўсёды


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праводзіліся ў выглядзе масавых апытанняў, вынікі якіх прадстаўляліся ў кантэксце сацыяльна-дэмаграфічных прыкмет.

Аднак у апошні час вывучэнне бібліятэчнай аўдыторыі пачынае праводзіцца ў форме апытання (інтэрв'юіравання і інш.) «прафесійных карыстальнікаў» – пастаянных, шматгадовых чытачоў бібліятэкі, чыё меркаванне і аб працы канкрэтнай бібліятэцы, і праблемах бібліятэк у цэлым заслугоўвае асаблівай увагі. Іншымі словамі, гэтыя чытачы выступаюць фактычна ў ролі экспертаў. Часцей выкарыстоўваецца і такі від апытання, як прэсавае апытанне – апытанне праз газэту ці іншы канал масавай інфармацыі (напрыклад, сацыяльныя медыя). Зразумела, што ён выяўляе думкі найбольш актыўнай часткі бібліятэчнай аўдыторыі і таму аказваецца хутчэй папярэднім этапам фарміравання фокус-групы, чым традыцыйным апытаннем.

**Назіранне** – адзін з самых традыцыйных метадаў збору інфармацыі. Часта яно аказваецца надзейным падмуркам для змястоўных высноў. Напрыклад, назіранне паказвае, што вучнёўская моладзь складае сёння самую прыкметную частку аўдыторыі публічных бібліятэк, але яе запыты звычайна носяць цалкам канкрэтны і прадказальны характар. Значна радзей у бібліятэчных даследаваннях выкарыстоўваецца **структураванае назіранне**, г.зн. назіранне па спецыяльнай, загадзя распрацаванай праграме. Метад структураванага назірання павінен выкарыстоўвацца ў спалучэнні з іншымі метадамі збору сацыялагічнай інфармацыі. Распаўсюджаны ў замежнай практыцы метад “кейс-стады” (паглыбленага аналізу канкрэтнага выпадку звычайна некалькімі даследчыкамі) у айчынных бібліятэчных даследаваннях пакуль не атрымаў прымянення.

### *Тэма 7. Методыка правядзення анкетнага апытання*

Найбольш распаўсюджаным на сённяшні дзень метадам збору першаснай інфармацыі ў бібліятэчных сацыялагічных даследаваннях з'яўляецца анкетнае апытанне. Метад гэты мае свае асаблівасці, свае перавагі і недахопы. Гэта параўнальна танны спосаб атрымання патрэбнай інфармацыі. Лічыцца, што анкетаванне, якое забяспечвае ананімнасць апытваных, дазваляе атрымаць у цэлым больш праўдзівую інфармацыю, чым інтэрв'ю. Апытанне па анкеце патрабуе жорсткі парадак пытанняў, выразнасць іх зместу і формы. Паколькі паводзіны рэспандэнта падчас запаўнення анкеты кантраляваць немагчыма, неабходна дакладна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фармуляваць пытанні, не дапускаць двухсэнсоўных варыянтаў адказу на закрытыя пытанні, цалкам распрацоўваць набор альтэрнатыў і г.д.

**Прынцыпы канструявання анкеты**

- імкненне да паўнаты рэалізацыі даследчых задач;
- улік спецыфікі рэспандэнта (анкета павінна быць зразумелая неспецыялісту);
- нейтральныя фармулёўкі пытанняў (фармулёўка пытання або варыянтаў адказаў не павінна навязваць рэспандэнту той ці іншы выбар);
- адназначная інтэрпрэтацыя пытанняў (калі фармулёўку пытання можна ўспрымаць па-рознаму, яго патрэбна перафармуляваць);
- улік псіхалагічных фактараў (анкета павінна пачынацца і заканчвацца больш простымі пытаннямі (фактар ўключэння ў работу), анкета не павінна быць занадта доўгай (фактар стомленасці) і г.д. Аптымальны час запаўнення анкеты 20-30 хвілін.

Анкета складаецца з трох асноўных раздзелаў: уступнай часткі, асноўнай часткі і заключнай часткі.

**Уступная частка** ўключае: зварот да рэспандэнтаў (Дарагія студэнты!); інфармацыю аб арганізацыі, якая праводзіць даследаванне; тэму, мэту даследавання; інструкцыі па запаўненню анкеты; гарантыі ананімнасці; падзяку за ўдзел у апытанні.

**Асноўная частка** змяшчае тэматычныя пытанні, якія дазваляюць рэалізаваць мэту і задачы даследавання.

**Заключная частка** ўключае звесткі аб рэспандэнце: агульныя (пол, узрост, адукацыя, месца жыхарства і інш.) і спецыяльныя (пасада, сацыяльны статус, нацыянальнасць і інш.). Выбар характарыстык рэспандэнта павінен быць арыентаваны на магчымасць праверкі асноўных гіпотэз, выяўленне адрозненняў паміж групамі, якія ўваходзяць у генеральную сукупнасць.

Распрацоўваючы асноўную частку анкеты, якая змяшчае тэматычныя пытанні, трэба зыходзіць з асаблівасцяў асноўных відаў пытанняў. **Класіфікацыя асноўных відаў пытанняў** прадстаўлена ў табліцы:

| **1. Па ступені стандартызацыі** | | |
|---|---|---|
| ***Адкрытыя***<br>Не ўключаюць варыянты адуказаў | ***Закрытыя***<br>Патрабуюць выбар з гатовых варыянтаў | ***Напаўзакрытыя***<br>Магчымы як выбар гатовага варыянту, так і свой варыянт адказу |
| **2. Па канструктыўных асаблівасцях** | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

<table>
<tr><td>Дыхатамічныя<br>Патрабуюць жорсткай згоды або нязгоды – «так» або «не»</td><td colspan="2">Альтэрнатыўныя<br>Магчымы выбар толькі аднаго адказу з трох ці больш варыянтаў</td><td>Полівaрыянтныя<br>Дапускаюць выбар некалькіх варыянтаў адказу</td></tr>
<tr><td>Шкальныя</td><td colspan="3">Пытанні-дыялогі</td></tr>
<tr><td>Змяшчаюць вербальныя ці графічныя шкалы (напрыклад, «Ацаніце свае вакальныя здольнасці па пяцібальнай шкале»)</td><td colspan="3">Працягнуць дыялог, выказаўшы ўласнае меркаванне (напрыклад, «Некаторыя людзі лічаць, што …, іншыя – што … А што думаеце Вы?»</td></tr>
<tr><td colspan="4">3. Па функцыях</td></tr>
<tr><td>Фільтры<br>Вылучаюць групу рэспандэнтаў з патрэбнай прыкметай і дазваляюць адрасаваць ёй спецыяльныя пытанні: (напрыклад, «Скажыце, калі ласка, ці ёсць у Вас прафесійная бібліятэчная адукацыя. Калі няма, то пераходзіце да пытанняў 10–15».</td><td colspan="2">Кантрольныя<br>Правяраюць шчырасць і ўстойлівасць пазіцыі рэспандэнта (мінімум два пытанні на адну і тую ж тэму з рознай фармулёўкай)</td><td>“Навадныя "<br>Дазваляюць дакладней зразумець сэнс асноўнага пытання, даць на яго больш дакладны адказ. Пасля пытання «Ці задавальняе Вас якасць ...?» можа ісці пытанне з просьбай ацаніць якасць па канкрэтных параметрах</td></tr>
<tr><td>Прамыя</td><td colspan="3">Ускосныя</td></tr>
<tr><td>Напрыклад, «Як Вы лічыце, ці павінна быць адменена смяротнае пакаранне?»</td><td colspan="3">Напрыклад, «Некаторыя людзі лічаць, што смяротнае пакаранне трэба адмяніць, таму што яго наяўнасць павышае агульны ўзровень агрэсіі ў грамадстве. Ці згодныя Вы з гэтым меркаваннем?»</td></tr>
</table>

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння існуе магчымасць стварэння анкетнага апытання ў Інтэрнэце з дапамогай спецыяльных праграм, іх вялікая колькасць. Як правіла, яны дазваляюць не толькі размясціць анкету ў сетцы, але і апрацаваць атрыманыя вынікі. Аднак большасць бясплатных сэрвісаў абмежаваныя ў колькасці апытанняў, рэспандэнтаў і ў сваім функцыянале. Яны не дазваляюць ажыццявіць дэталёвы аналіз даных, выгрузіць вынікі анкетавання ў Excel і праглядзець адказы кожнага рэспандэнта асобна.

Добрай і бясплатнай альтэрнатывай з'яўляюцца **Google Forms.**

Гатовыя формы анкет можна выбіраць з мноства варыянтаў, прадстаўленых у розных сэрвісах (можна проста гугліць «анлайн анкетаванне»).

**Логіка пабудовы анкеты**

Пачынаць анкету варта з простых пытанняў, якія не закранаюць якіх-небудзь далікатных тым, напрыклад, узроўню адукацыі. Уступныя пытанні анкеты прызначаныя для ўстанаўлення кантакту з рэспандэнтам. Звычайна пачатак анкеты змяшчае пытанні падзейнага характару, якія не выклікаюць цяжкасцяў у адказе (напрыклад, як даўно рэспандэнт запісаны ў бібліятэку; як часта ён яе наведвае; ці ёсьць у яго хатняя бібліятэка і г.д.). Калі анкета пачынаецца з цяжкіх пытанняў, то гэта можа выклікаць непакой рэспандэнта, што прывядзе да павелічэння адмоў ад запаўнення анкеты. Калі ж гэтыя пытанні з'яўляюцца тады, калі чалавек ужо ўключыўся ў працу, то ён будзе хутчэй схільны яе завяршыць, чым кінуць на паўдарозе.

Заключныя пытанні анкеты таксама павінны быць нескладанымі, паколькі неабходна ўлічваць, што запаўненне анкеты досыць цяжкі занятак, асабліва для людзей сталага ўзросту з адносна невысокім узроўнем адукацыі.

Дынаміка развіцця анкетнага апытання павінна быць прыкладна наступнай: першая палова анкеты – паступовае ўскладненне пытанняў, потым невялікі спад, рэспандэнту даюць магчымасць крыху адпачыць, калі задаюць адносна простыя пытанні, затым ідуць самыя складаныя пытанні, пасля чаго – рэзкае памяншэнне складанасці і завяршэнне работы. Па часе запаўнення анкеты бываюць як вельмі маленькімі (так званыя «экспрэс-анкеты»), запаўненне якіх патрабуе ўсяго толькі некалькіх хвілін, так і вельмі вялікімі, якія патрабуюць да двух гадзін працы. Аптымальным лічыцца апытальнік, які займае ў рэспандэнтаў 20-30 хвілін, паколькі вельмі маленькая анкета стварае ўражанне чагосьці несур'ёзнага, а вялікая выклікае стому, што не можа не адбівацца на якасці атрыманай інфармацыі.

Некаторыя агульныя патрабаванні да **мовы анкеты** можна прадставіць наступным чынам:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а) неабходна выкарыстоўваць жывую размоўную, але не спрошчаную мову;

б) пытанні павінны быць не вельмі доўгімі і не ўключаць складаныя граматычныя канструкцыі;

в) у пытаннях не рэкамендуецца выкарыстоўваць фармулёўкі з падвойным адмаўленнем;

г) пытанні не павінны ўтрымліваць словы і словазлучэнні, сэнс якіх можа быць незразумелы нейкай часткай рэспандэнтаў;

в) пытанні павінны быць адназначнымі, гэта значыць іх разуменне не павінна залежаць ад узроўню культуры ці адукацыі рэспандэнтаў;

е) пытанні не павінны выходзіць за рамкі кампетэнтнасці апытваных – пытацца варта толькі аб тым, што рэспандэнту вядома, пра што ў яго можа быць свая думка; выключэнне могуць складаць толькі тыя выпадкі, калі задачай даследавання з'яўляецца выяўленне якіх-небудзь стэрэатыпаў масавай свядомасці.

Пытанні анкеты павінны быць добра ўпарадкаваны. Адны і тыя ж пытанні, размешчаныя ў рознай паслядоўнасці, могуць даць розную інфармацыю. Неабходна ўвесь час мець на ўвазе, што пытанні ў анкеце не ўспрымаюцца рэспандэнтам ізалявана, бо яны знаходзяцца ў складаным узаемадзеянні паміж сабой. Калі рад пытанняў лагічна звязаны і паслядоўна звужае тэму, у рэспандэнта ўзнікае пэўная псіхалагічная ўстаноўка, якая будзе ўплываць на яго адказы. У некаторых выпадках наогул мэтазгодна не выкарыстоўваць якое-небудзь прамое пытанне, калі ёсць вялікая небяспека стварэння моцнай ўстаноўкі, ад якой будзе вельмі цяжка пазбавіцца. Так, калі ў анкеце, прысвечанай праблемам чытання, задаць прамое пытанне: «Ці любіце Вы чытаць?», то адказ на гэтае пытанне будзе ўплываць на ўсе пытанні, звязаныя з чытаннем. Выснову пра тое, ці любіць чытаць рэспандэнт, можна будзе зрабіць на падставе яго адказаў на іншыя пытанні, якія характарызуюць яго ўзаемаадносіны з кнігай.

Размяшчэнне пытанняў у анкеце абумоўлівае яшчэ адну сур'ёзную праблему – праблему манатоннасці. Вядома, што калі рэспандэнту задаецца мноства пытанняў, сфармуляваных па адной і той жа сінтаксічнай схеме (асабліва гэта адносіцца да пытанняў у табліцах, пры матрычнай форме канструявання апытальніка), то гэта прыводзіць да павелічэння непрадуманых адказаў рэспандэнтаў, да пропуску пытанняў або да механічнага адказу на іх.

Да пачатку распаўсюджвання анкеты важна правесці яе **экспертызу** з мэтай атрымання водгуку або рэцэнзіі. Пажадана, каб у ролі экспертаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выступалі два спецыялісты: адзін – у прадметнай сферы, якая вывучаецца (каталагізатар, маркетолаг і інш.), а другі – з вопытам правядзення навукова-даследчай работы з выкарыстаннем метаду анкетавання.

Нават калі даследчык шматкроць прадумаў логіку разгортвання ўсёй анкеты, кожны блок і асобнае пытанне, ён усё роўна не можа быць да канца ўпэўнены ў яе поўнай адпаведнасці мэтам і задачам даследавання. Само разуменне пытанняў і мовы, якая выкарыстоўваецца даследчыкам, можа выклікаць розныя цяжкасці ў той аўдыторыі, для якой прызначана анкета. Для ліквідацыі магчымых праблем (асабліва пры правядзенні масавых апытанняў) рэкамендуецца апрабаваць анкету на міні-выбарцы ў 25-30 чалавек, структура якой павінна адпавядаць па асноўных параметрах планаванай выбарцы. **Пілатажнай апытанне** павінны праводзіць дасведчаныя інтэрв'юеры, якія ў ходзе анкетавання назіраюць за рэакцыяй рэспандэнтаў, ацэньваюць разуменне імі пытанняў, фіксуюць каментары і заўвагі, якія ўзнікаюць у працэсе запаўнення анкеты.

Мэту пілатажнага апытання можна канкрэтызаваць, адказаўшы на наступныя пытанні:

а) ці вытрыманыя патрабаванні да мовы анкеты, ці не з'яўляецца яна занадта складанай або, наадварот, занадта прымітыўнай для нейкай часткі апытваных?

б) ці ўсе пытанні і варыянты адказаў зразумелыя?

в) ці не занадта абстрактныя фармулёўкі пытанняў і варыянты адказаў?

г) ці кампетэнтныя рэспандэнты для адказаў на пытанні, ці не варта выкарыстоўваць «фільтры»?

в) ці не ўзнікае празмернай стомы рэспандэнтаў? Калі яна ўзнікае, як яе пазбегнуць?

е) ці не ўзнікае праблема манатоннасці, ці няма небяспекі атрымання стэрэатыпных адказаў?

ж) ці не занадта шматлікія варыянты адказаў на пытанні? Калі так, то як скараціць іх колькасць ці як лепш іх раздзяліць?

з) ці не выклікаюць пытанні раздражнення ў рэспандэнтаў, не ўзнікаюць у іх якіх-небудзь іншых адмоўных эмоцый?

Абагульняючы вышэй сказанае, вылучым **асноўныя этапы стварэння анкеты**:

• вызначэнне тыпаў пытанняў і сцвярджэнняў (па змесце і форме), якія падлягаюць фіксаванню;

• фармулёўка пытанняў і сцвярджэнняў;

• падрыхтоўка першага праекта анкеты;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

• экспертыза анкеты;
• папярэдняе тэставанне падчас пілатажнага даследавання.

*Тэма 8. Методыка інтэрв'ю. Выкарыстанне метаду фокус-груп у сацыялагічных даследаваннях бібліятэчнай дзейнасці*

**Інтэрв'ю** – гэта такі метад сацыялагічнага даследавання, у аснове якога ляжыць непасрэднае ўзаемадзеянне даследчыка з рэспандэнтам. Інтэрв'ю праходзіць у форме гутаркі двух людзей, пры актыўнай ролі інтэрв'юера – ён вядзе гутарку, задае пытанні рэспандэнту, фіксуе яго адказы.

Пры выкарыстанні ў сацыялагічным даследаванні інтэрв'ю не ўзнікае такіх праблем, якія з'яўляюцца пры анкетаванні, у прыватнасці, праблема вяртання анкет. Але інтэрв'ю дарагі метад. Ён патрабуе вялікіх выдаткаў часу, сродкаў на падбор і падрыхтоўку інтэрв'юераў, кантроль якасці іх работы.

Аднак гэтыя выдаткі кампенсуюцца тым, што інтэрв'юер здольны пазітыўна ўздзейнічаць на сітуацыю апытання, схіліць рэспандэнта да даверлівай гутаркі. Пры тым, безумоўна, уплыў інтэрв'юера значна мацнейшы, чым, чым уплыў даследчыка пры анкетаванні.

Неабходна памятаць, што адзін інтэрв'юер можа правесці не больш за 35 інтэрв'ю ў дзень. Таму для масавых апытанняў важна выкарыстоўваць сетку добра падрыхтаваных інтэрв'юераў.

Існуе некалькі відаў інтэрв'ю: стандартызаванае (фармалізаванае) і вольнае, факусаванае (накіраванае), тэлефоннае і іншыя.

**Фармалізаванае інтэрв'ю з закрытымі пытаннямі** выкарыстоўваюць пры апытанні значнай сукупнасці людзей (напрыклад, ад некалькіх соцень да паўтары тысячы чалавек). **Фармалізаванае інтэрв'ю з адкрытымі пытаннямі** прадугледжвае большую свабоду, самастойнасць у фармулёўцы адказаў рэспандэнтамі і патрабуе больш выразнай працы інтэрв'юера.

**Свабоднае інтэрв'ю** – метад збору інфармацыі, які выкарыстоўваецца даволі рэдка. Пры яго выкарыстанні даследчык загадзя вызначае асноўныя напрамкі гутаркі і максімальна выразна фіксуе адказы на сфармуляваныя ўжо ў ходзе гутаркі пытанні. Патрабуецца высокі ўзровень падрыхтоўкі інтэрв'юера. Як правіла, такі від інтэрв'ю выкарыстоўваецца на пачатковых этапах даследавання.

**Накіраванае або факусаванае інтэрв'ю** валодае меншай ступенню стандартызацыі ў параўнанні з фармалізаваным інтэрв'ю. У ім змяшчаецца толькі неабходны пералік пытанняў, якія тычацца пэўнай тэмы (напрыклад,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пытанні аб працы рэспандэнта, яго меркаванне аб пэўнай бібліятэчнай паслуге або па сістэме інфармацыйных рэсурсаў і г.д.). Такім чынам, дасягаецца мэта “факусіроўцы” ўвагі апытванага на пэўнай праблеме.

Адным з самых распаўсюджаных відаў інтэрв'ю, якія ўжываюцца сацыёлагамі заходніх краін, з'яўляецца **тэлефоннае інтэрв'ю**. У ліку пераваг гэтага метаду аператыўнасць, нізкі кошт, магчымасць ажыццяўляць кантроль за ходам інтэрв'ю і працай інтэрв'юераў. Істотным недахопам лічаць непрацягласць гутаркі па тэлефоне. Іншыя патрабаванні прад'яўляюцца і да пабудовы апытальніка: больш простыя і канкрэтныя фармулёўкі, адсутнасць доўгіх пералікаў у пытаннях.

Вялікае значэнне надаецца інструкцыі для інтэрв'юераў, у якой паказваюцца ўсе складанасці апытальніка, правілы рэгістрацыі адказаў рэспандэнтаў, пераходы ад аднаго пытання да іншага.

Перш, чым будзе праведзена апытанне (інтэрв'юіраванне) на вылучаным аб'екце, праводзіцца папярэдняя **апрабацыя апытальніка** (як і для анкетавання). Высвятляецца: ці ўсё пытанні зразумелыя рэспандэнтам, якія цяжкасці сустракаюцца пры адказах, якія пытанні “працуюць”, а якія “не працуюць”. Такім чынам, працэдура пілатажу дазваляе вызначыць якасць распрацаванага інструментара, складанасці і цяжкасці выкарыстання пры правядзенні палявога этапу даследавання.

**Метад фокус-груп**, або групавое глыбіннае інтэрв'ю з'яўляецца сінтэзам метаду факусаванага інтэрв'ю, распрацаванага амерыканскім сацыёлягам Р. Мертанам і яго калегамі ў 1940-х - 1950-х гг., і практыкі выкарыстання групавых інтэрв'ю ў даследаваннях рынку, якая шырока распаўсюдзілася ў ЗША ў гэтыя ж гады. Метад фокус-груп у цяперашні час распаўсюдзіўся за межы маркетынгу, а тэрмін «фокус-група» трывала ўвайшоў у навуковы абарот.

З'яўленне і наступнае ўдасканаленне метаду фокус-груп мела на мэце злучэнне вартасцяў глыбіннага індывідуальнага інтэрв'ю і групавога факусаванага інтэрв'ю, якое дазваляе выявіць разуменне і ацэнкі адной і той жа падзеі або з'явы значным лікам людзей у сітуацыі «тварам да твару» і «тут і цяпер». Метад фокус-груп адносіцца да кірунку якасных метадаў у сацыялогіі. Акрамя фокус-груп да іх адносяцца: “кейс-стады”, а таксама этнаграфічныя даследаванні, вусная гісторыя, гісторыя жыцця, гісторыя сям'і. Найбольш прыдатным і апрабаваным у сацыялогіі бібліятэчнай справы лічыцца метад фокус-груп, што не выключае магчымасці выкарыстання і іншых згаданых тактык.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Методыка фокус-груп уяўляе сабой нестандартызаванае інтэрв'ю, але праводзіцца яно не з адным чалавекам, а адначасова з групай людзей, падобных па шэрагу сацыяльных прыкмет. Выкарыстанне эфекту групавога ўзаемадзеяння падчас абмеркавання тэмы надае гэтаму віду інтэрв'ю новыя рысы і магчымасці.

Інтэрв'ю праводзіцца ў форме абмеркавання па загадзя падрыхтаваным мадэратарам сцэнару (апытальніку, плану) пытанням.

**Група ўдзельнікаў абмеркавання** складае, як правіла, 8-10 чалавек. Калі будзе меншая колькасць людзей (напрыклад, 4 чалавекі), то абмеркаванне хутка згасае. Калі удзельнікаў будзе больш за 10 чалавек, то не ўсе атрымаюць магчымасць выказаць сваё меркаванне, і абмеркаванне будзе праходзіць не з усёй групай, а з яе часткай.

Асноўнае патрабаванне да складу групы – яе **аднастайнасць**. Члены групы не павінны аказваць на іншых якога-небудзь уплыву або ціску тым, што: ўдзельнік групы мае большы жыццёвы вопыт, належыць да больш старэйшай узроставай групы, мае больш высокія даходы, валодае больш высокім статусам, у яго больш высокі ўзровень ведаў.

У большасці выпадкаў група падбіраецца такім чынам, каб у ёй былі незнаёмыя адзін аднаму людзі прыкладна аднолькавага ўзросту, аднаго полу, з адной групы па даходах, хоць многае залежыць ад абмяркоўваемай праблематыкі.

**Роля мадэратара ў фокус-групе** – кіраванне ходам дыскусіі, вядзенне яе ў адпаведнасці са сцэнарам. Ён задае пытанні, удакладняе атрыманыя адказы, стымулюе, падштурхоўвае да размовы малаактыўных удзельнікаў, спыняе гаваркіх.

Да мадэратару прад'яўляецца шмат патрабаванняў, найважнейшымі з якіх з'яўляюцца:

• уменне працаваць з рознымі па характары малымі групамі (акыўнымі і пасіўнымі, якія пазбягаюць абмеркавання, з лідэрам і без яго);
• уменне слухаць людзей і накіроўваць гутарку ў патрэбнае рэчышча;
• уменне стымуляваць абмеркаванне галоўных момантаў у дыскусіі.

Галоўная задача мадэратара – арганізацыя вольнага абмеркавання пытанняў, якія цікавяць даследчыка, у нязмушанай абстаноўцы. Пры гэтым сам мадэратар не ўдзельнічае ў абмеркаванні і не выказвае ацэначных меркаванняў.

Звычайна сцэнар для фокус-груп уключае каля 10 асноўных пытанняў, абмеркаванне якіх доўжыцца 1,5 – 2 гадзіны.

**Арганізацыя дыскусіі** ўключае наступныя этапы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

• Пачатковы этап – уступнае слова мадэратара, інфармацыя аб тэме і мэтах дыскусіі, запіс імёнаў удзельнікаў;

• «Разаграванне» групы – простыя пытанні, адрасаваныя кожнаму ўдзельніку абмеркавання па чарзе;

• Асноўная частка дыскусіі, дзе абмеркаванне рэгулюецца мадэратарам і вядзецца па загадзя распрацаваным плане;

• Завяршальны этап – фінальнае рэзюмэ мадэратара, дзе сумуюцца прадстаўленыя ў абмеркаванні пункты гледжання, выніковыя каментары ўдзельнікаў фокус-групы. Па выніках фокус-групы мадэратар рыхтуе справаздачу аб выніках даследавання.

Якасць матэрыялу, атрыманага ў выніку правядзення фокус-групы, шмат у чым залежыць ад умення і навыкаў мадэратара.

Фокус-групы прымяняюцца ў наступных выпадках:

- для ацэнкі новых праграм, новаўвядзенняў;
- пры вывучэнні ўплыву сродкаў масавай інфармацыі ці інфармацыі сацыяльных медыя;
- у маркетынгавых даследаваннях;
- у прыкладных даследаваннях пры распрацоўцы праграмы і для апрабацыі апытальніку.

Метад фокус-груп валодае шэрагам пераваг перад іншымі метадамі атрымання сацыялагічнай інфармацыі:

- фокус-група праходзіць у натуральнай абстаноўцы, у якой чалавек свабодна выказвае сваё меркаванне;
- у адрозненне ад глыбіннага інтэрв'ю, у дыскусіі ўдзельнічае вялікая сукупнасць людзей;
- мадэратар падчас дыскусіі можа ўдакладняць адказы ўдзельнікаў;
- вынікі фокус-груп могуць быць атрыманы хутчэй, чым пры выкарыстанні іншых метадаў, яны больш наглядныя і зразумелыя спажыўцам інфармацыі, чым, напрыклад, табліцы размеркавання адказаў рэспандэнтаў на пытанні анкеты;
- кошт правядзення фокус-груп адносна нізкі ў параўнанні, напрыклад, з масавымі апытаннямі насельніцтва.

**Аналіз вынікаў фокус-групы.** Паколькі работа фокус-груп часта з'яўляецца складовай часткай сацыялагічнага даследавання, сацыёлаг выконвае ролю і мадэратара, і аналітыка вынікаў дыскусіі.

Калі фокус-група выкарыстоўваецца на этапе распрацоўкі метадычнага інструментара колькаснага даследавання, сацыёлаг мае праект анкеты. Асноўнымі крыніцамі памылак пры правядзенні анкетнага апытання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'яўляюцца няправільнае разуменне рэспандэнтамі задаваных пытанняў, недакладнасці ў фармуляванні варыянтаў адказаў на закрытыя пытанні і інш. Перавага групавога інтэрв'ю заключаецца ў магчымасці выкарыстання розных варыянтаў пастаноўкі пытанняў і выбару найбольш прыдатнага, паглыбленага і рознабаковага аналізу зместу закрытых пытанняў. Гэта ж адметнасць метаду фокус-груп можа быць выкарыстана для фармулявання гіпотэз, якія могуць быць пакладзены ў аснову фармулёвак адкрытых пытанняў анкеты.

Калі сацыёлаг выкарыстоўвае метад фокус-груп, не маючы праекта анкеты, аналіз вынікаў групавога інтэрв'ю вядзецца па іншай схеме. На этапе распрацоўкі праграмы (плана) групавога інтэрв'ю сацыёлаг ажыццяўляе пошук кадзіровачных катэгорый, г.зн. паняційнага апарату, які складае сэнсавы каркас анкеты. Напрыклад, пры вывучэнні задаволенасці чытачоў якасцю абслугоўвання ў бібліятэцы сацыёлаг можа на падставе асабістага і прафесійнага вопыту вызначыць прыкладнае кола паняццяў, якія вызначаюць змест або ўплываюць на задаволенасць абслугоўваннем: інтэнсіўнасць карыстання бібліятэкай, важнасць той ці іншай паслугі, задаволенасць яе якасцю, профіль інфармацыйных патрэбаў, мэты карыстання бібліятэкай, матывы звароту ў бібліятэку і да т. п. У выніку аналізу групавога інтэрв'ю гэты спіс можа быть істотна відазменены, пашыраны, могуць быць выяўлены папярэднія залежнасці паміж рознымі характарыстыкамі чытацкіх паводзін, якія замацоўваюцца ў адпаведных паняццях.

Вынікі групавога абмеркавання карысна аформіць у выглядзе самастойнага дакумента – кароткай справаздачы, якая складаецца з некалькіх раздзелаў:

1. Ва ўводзінах можна даць кароткую інфармацыю пра мэты абмеркавання і пра месца, якое яно займала ў агульным даследаванні.

2. У метадалагічным раздзеле мэтазгодна даць апісанне спосабаў правядзення групы: дзе было праведзена абмеркаванне, якім чынам адбіраліся рэспандэнты для ўдзелу ў групе, калі было праведзена пасяджэнне.

3. У асноўным раздзеле варта выкласці інтэрпрэтацыю вынікаў абмеркавання, вылучыць найбольш важную інфармацыю, атрыманую ў ходзе абмеркавання.

4. У заключэнні рэкамендуецца прапанаваць рэкамендацыі або тэмы для наступных абмеркаванняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 9. Экспертнае апытанне ў даследаванні бібліятэказнаўчых працэсаў і з'яў*

**Экспертнае апытанне** – разнавіднасць сацыялагічнага апытання, падчас якога рэспандэнтамі выступаюць эксперты. Апытанне экспертаў – зварот з пытаннямі да прафесіяналаў, якія маюць спецыяльныя веды і вопыт работы, дасягнулі поспеху і вядомасці ў сферы дзейнасці, звязанай з прадметам даследавання.

Прымяненне экспертнага апытання звязана з выкананнем пэўных правілаў. Пры яго арганізацыі ў бібліятэцы вялікую ўвагу трэба надаваць тром фактарам: падбору эксперта, працэдуры яго працы і валіднасці (дакладнасці) ацэнак эксперта.

Экспертам называецца спецыяліст у некаторай галіне, меркаванні і вывады якога маюць вялікую ступень верагоднасці і надзейнасці. Патрабуецца, каб эксперт быў высокакваліфікаваным спецыялістам; добра ведаў мінулае і сучаснае даследуемых аб'ектаў; імеў вопыт у распрацоўцы ацэнак і гіпотэз, альтэрнатыў і магчымых шляхоў вырашэння праблемных сітуацый.

Вельмі важна падбіраць такіх экспертаў, якія прытрымліваюцца неаднолькавых поглядаў па даследуемых праблемах, запрашаць прадстаўнікоў розных школ і накірункаў, сумежных галін ведаў.

**Фарміраваць групу экспертаў** можна некалькімі спосабамі. Часта выкарыстоўваецца спосаб, па якому аднаго кампетэнтнага спецыяліста просяць назваць некалькі асоб, якіх ён парэкамендуе ў якасці экспертаў па праблеме. Затым гэтае пытанне задаецца кожнаму з названых асоб. У экспертную групу ўключаюцца спецыялісты, якія набралі не менш за 70% галасоў.

Практыкуецца **працэдура самаацэнкі эксперта**, калі кандыдаты павінны самі паказаць ступень сваёй дасведчанасці па праблеме і аналітычныя здольнасці. Для таго да пачатку экспертызы ім прапануюць адказаць на пытанні аб працоўным стажу, наяўнасці друкаваных работ па тэме, удзелу ў даследаваннях, практычным вопыце, вопыце кіруючай працы і г.д.

Узровень кампетэнтнасці ацэньваецца каэфіцыентам кампетэнтнасці ***К***, які можа змяняцца ад "0" (поўная некампетэнтнасць) да "1" (поўная кампетэнтнасць).

Найбольш простая і зручная форма самаацэнкі экспертаў – сукупны індэкс, разлічаны на падставе ацэнкі экспертамі сваіх ведаў, вопыту і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

здольнасцяў па рангавай шкале з пазіцыямі «высокі», «сярэдні», «нізкі». Першай пазіцыі прыпісваецца лікавае значэнне “1”, другойі – “0,5”, трэцяй – “0”. У такім выпадку сукупны індэкс – каэфіцыент ўзроўню кампетэнтнасці эксперта (К) – вылічаецца па формуле:

$$K = \frac{k_1 + k_2 + k_3}{3}$$

дзе $k_1$ – лікавае значэнне самаацэнкі экспертам ўзроўню сваіх тэарэтычных ведаў; $k_2$ – лікавае значэнне самаацэнкі практычнага вопыту; $k_3$ – лікавае значэнне самаацэнкі здольнасці да прагнозу.

Звычайна ў якасці эксперта выбіраецца той бібліятэкар, у якога індэкс кампетэнтнасці не менш сярэдняга (0,5) і вышэй (да 1). Атрыманне першасных лікавых значэнняў самаацэнкі для разліку індэкса кампетэнтнасці экспертаў адбываецца пры дапамозе пытання ў таблічнай форме:

**Самаацэнка кампетэнтнасці экспертаў**

| **Крытэры** | **Высокі ўзровень** | **Сярэдні ўзровень** | **Нізкі ўзровень** |
|---|---|---|---|
| | 1 | 0,5 | 0 |
| Узровень тэарэтычных ведаў па праблеме ($k_1$) | + | | |
| Практычны вопыт ($k_2$) | | + | |
| Здольнасць прадбачыць логіку падзей, стану праблемы ($k_3$) | | + | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У дадзеным выпадку, зыходзячы з лікавых значэнняў адзнак, пазначаных крыжыкамі ў клетках табліцы, каэфіцыент кампетэнтнасці плануемага эксперта К = 0,7.

Яшчэ адзін метад адбору экспертаў – **калектыўная ацэнка аўтарытэтнасці эксперта**, прымяняецца ў буйных бібліятэках (абласнога і рэспубліканскага маштабу) і ў тым выпадку, калі бібліятэкары ведаюць адзін

аднаго як спецыялістаў. Складаецца спіс, які ўключае пэўную колькасць прэтэндэнтаў (напрыклад, 10). Кожны з іх павінен прадаставіць палову (5) найбольш, на яго думку, кампетэнтных калегаў. На падставе адказаў будуецца табліца, у якой нумарамі ад 1 да 10 абазначаюцца: у першым слупку – тыя, каго выбіраюць, а ў першым радку – тыя, хто выбірае. У клетках табліцы колькасць «1» пазначае выбар, «працяжнік» – адсутнасць выбару, «0” – паказвае на тое, што сябе ніхто не называе.

У адпаведнасці з данымі ранговой шкалы кампетэнтнасці выбіраецца неабходная колькасць экспертаў для апытання.

Магчыма пашырэнне групы экспертаў на асобных этапах даследавання. У гэтым выпадку эксперта просяць пры адказе на зададзенае пытанне адначасова рэкамендаваць некалькіх спецыялістаў, якія добра разбіраюца ў разглядаемай праблематыцы.

Ад таго, наколькі кваліфікавана састаўлены пытанні да экспертаў, залежыць якасць атрыманай інфармацыі. Пры састаўленні апытальніку важна раздзяліць складаныя пытанні на шэраг простых, але ўзаемазвязаных, пазбягаючы у той жа час залішняй дэталізацыі.

Практыка паказвае, што пры дакладнай фармулёўцы і разумнай дэталізацыі ўзрастае ўзгодненасць экспертных ацэнак. Таму трэба не прапусціць той крытычны момант, калі далейшая дэталізацыя пачынае зніжаць надзейнасць матэрыялу. Вызначыць мяжу дэталізацыі дапамагае пробнае анкетаванне, у ходзе якога высвятляецца, наколькі разыходзяцца адказы на адно і тое ж пытанне. Вялікае разыходжанне адбываецца або па прычыне залішняй дэталізацыі, або з-за недакладных фармулёвак, калі пытанні разумеюць па-рознаму.

У бібліятэчных даследаваннях выкарыстоўваюцца **індывідуальныя і калектыўныя экспертныя ацэнкі**. У першым выпадку эксперты даюць ацэнкі незалежна адзін ад аднаго, а потым іх адказы абагульняюцца аналітыкамі. У другім выпадку эксперты ў працэсе работы абменьваюцца меркаваннямі па спецыяльна распрацаваных правілах.

Да індывідуальных экспертных ацэнак адносяць экспертнае інтэрв'ю і аналітычныя экспертныя ацэнкі.

**Экспертнае інтэрвью** – гутарка даследчыка са спецыялістам, запрошаным у якасці эксперта. Па загадзя распрацаванай праграме даследчык прапануе эксперту шэраг пытанняў для абмеркавання. Поспех шмат у чым залежыць ад умення эксперта без падрыхтоўкі даваць адказы на складаныя пытанні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Метад аналітычнай экспертнай ацэнкі** патрабуе доўгай работы эксперта над аналізам прапануемых даследчыкам праблем.

Да найважнейшых метадаў калектыўных экспертых ацэнак адносяцца метады экспертнай камісіі, метад калектыўнай генерацыі ідэй і метад Дэльфі.

**Дыскусія** – від экспертнага апытання, які шырока прымяняецца на практыцы для абмеркавання праблем, шляхоў іх вырашэння, аналізу розных фактараў і г.д. Група экспертаў для правядзення дыскусіі павінна быць не больш за 20 чалавек. Сама дыскусія праводзіцца як адкрытае калектыўнае абмеркаванне праблемы, асноўнай задачай якога з'яўляецца ўсебаковы аналіз усіх фактараў, станоўчых і адмоўных наступстваў, выяўленне пазіцый і інтарэсаў удзельнікаў.

Дыскусія можа праводзіцца некалькі гадзін і таму неабходна вызначыць рэгламент работы: час на даклад вядучага і выступленні, правядзенне перапынкаў. Пасля заканчэння дыскусіі праводзіцца аналіз запісаў для больш выразнага прадстаўлення асноўных вынікаў, выяўлення адрозненняў у меркаваннях.

**Групавыя экспертныя ацэнкі** могуць праводзіцца ў форме:

- *адкрытага абмеркавання* пытанняў з наступным адкрытым або закрытым галасаваннем;
- *закрытага абмеркавання* (абмеркавання без прамога кантакту яго ўдзельнікаў пры захаванні ананімнасці іх меркаванняў) з наступным закрытым галасаваннем або запаўненнем анкет экспертнага апытання;
- *свабоднага выказвання* без абмеркавання і галасавання.

Вопыт паказвае, што **адкрытае абмеркаванне** пастаўленых перад групай экспертаў пытанняў да дасягнення пэўнай згоды паміж імі або да выпрацоўкі агульнай пазіцыі мае шэраг істотных недахопаў. Да іх адносяцца, у прыватнасці, узаемны ўплыў меркаванняў экспертаў і нежаданне іх адмаўляцца ад меркаванняў, раней выказаных публічна. Таму пры падрыхтоўцы рашэнняў усё больш шырока ўжываецца закрытае абмеркаванне і свабоднае выказванне.

**Закрытае абмеркаванне** можна падпадзяліць на дзве катэгорыі: апытанне, якое праводзіцца ў адзін тур, шляхам аднаразовага запаўнення анкет, і апытанне, якое праводзіцца ў некалькі тураў, шляхам шматразовага запаўнення анкет экспертнага апытання для паслядоўнага ўдакладнення ацэнак.

Вылучаюць таксама метады **завочнага і вочнага экспертнага апытання**. Найбольш простым відам завочнага апытання экспертаў з'яўляецца пісьмовае апытанне (збор меркаванняў): экспертам рассылаюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(раздаюцца) адмыслова падрыхтаваныя апытальныя лісты, у якіх яны павінны выказаць сваё меркаванне па сутнасці пастаўленых пытанняў. Пры складанні экспертнага апытальніка выкарыстоўваецца ад 50 да 90% адкрытых пытанняў. Збор меркаванняў падобны свабоднаму інтэрв'ю і адрозніваецца ад яго толькі пісьмовай формай апытання, якая дае магчымасць прыцягнуць вялікую колькасць экспертаў. Праўда, завочнае апытанне звязана з арганізацыйнымі цяжкасцямі, абумоўленымі нізкім узроўнем вяртання анкет.

**Фармалізаванае апытанне экспертаў** уяўляе сабой звычайнае анкетаванне з пытаннямі, сфармуляванымі як у адкрытай, так і ў закрытай форме. Па мэтах, задачах і змесце гэты метад істотна адрозніваецца ад пісьмовага збору меркаванняў. Калі пісьмовы збор меркаванняў праводзіцца для выяўлення прынцыпова новых ідэй, поглядаў на праблему, нечаканых падыходаў да старой праблемы, то анкетаванне накіравана на высвятленне ацэнак тых ці іншых аспектаў гатовага рашэння. Звычайны метад аналізу даных у такім выпадку – статыстычны.

Верагоднасць і дакладнасць экспертных ацэнак павышаецца за кошт карэктнага падбору экспертаў і захавання працэдуры экспертнага апытання.

### *Тэма 10. Абагульненне і аналіз вынікаў сацыялагічнага даследавання*

Сабраныя з дапамогай розных метадаў даныя самі па сабе не дазваляюць зрабіць абагульняльныя высновы, праверыць гіпотэзы, выявіць тэндэнцыі і г.д. Іх неабходна прадставіць у выглядзе абагульненых статыстычных паказчыкаў, якія варта прааналізаваць і інтэрпрэтаваць.

Разгледзім этапы аналізу вынікаў даследавання, атрыманых метадам анкетнага апытання.

Перш за ўсё, праводзіцца **выбракоўванне** – адсяванне з агульнага масіву сабранага інструментара (запоўненых анкет, бланкаў інтэрв'ю, карт назірання і г.д.). Ажыццяўляецца ў выпадках, калі інструментар не цалкам запоўнены (напрыклад, анкета выбракоўваецца ў выпадку, калі яна запоўненая менш чым на 70%); калі інструментар запоўнены нядбайна, з папраўкамі, якія выключаюць магчымасць выразнага вызначэння адказу рэспандэнта і інш.

Таксама на этапе апрацоўкі інфармацыі адбываецца **нумарацыя** запоўненага інструментара (напрыклад, атрыманых пасля запаўнення рэспандэнтамі анкет). Гэта трэба для таго, каб ведаць агульны аб'ём

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эмпірычнага масіва, а таксама ў выпадку памылкі ўводу мець магчымасць аператыўна знайсці арыгінал (па нумары).

Далей атрыманыя ў анкетным апытанні даныя неабходна **закадаваць** і ўнесці ў кампутарную базу даных. Для гэтага можна выкарыстоўваць рознае праграмнае забеспячэнне. Часцей за ўсё, гэта **праграмы SPSS** і **Exel**.

Кожнай анкеце прысвойваецца індывідуальны нумар, і даныя, якія змяшчаюцца ў ёй, набіваюцца ў адзін радок. У выніку ствараецца табліца даных, дзе ў верхніх слупках прадстаўлены пытанні анкеты, а кожны радок утрымлівае адказы на гэтыя пытанні, змешчаныя ў адной канкрэтнай анкеце.

У закрытых пытаннях варыянты адказаў ужо адзначаны лічбавым кодам. Варыянты адказаў на адкрытыя пытанні неабходна закадаваць, папярэдне зрабіўшы для іх класіфікацыю, аб'яднаўшы ў групы і прысвоіўшы кожнай групе лікавае значэнне.

У выніку кампутарнай апрацоўкі базы даныя апытання могуць быць прадстаўлены ў розных абагульненых формах – у выглядзе груповак і шэрагаў размеркавання прыкмет.

Складанне табліц не з'яўляецца асобным відам матэматычнай аперацыі. Яны з'яўляюцца формай адлюстравання шэрагаў размеркавання. Найбольш простая форма табліцы – **пералікавая табліца**, якая складаецца на падставе шэрагу размеркавання па адной прыкмеце.

Больш складанай формай табліцы з'яўляецца **камбінацыйная табліца**, або **табліца спалучэння**. Яна адлюстроўвае размеркаванне па двух і больш прыкметах.

**Графічны спосаб** прадстаўлення сацыялагічных даных выкарыстоўваецца ў мэтах нагляднасці. Найбольш часта дадзеныя апытання адлюстроўваюцца ў выглядзе разнастайных **дыяграм**.

Неабходна таксама даць **вербальную інтэрпрэтацыю даных**, прадстаўленых у табліцах і дыяграмах. У гэтым апісанні важна паказаць цэнтральную тэндэнцыю размеркавання прыкмет, параўнаць размеркаванні прыкмет у розных групах, выдзеленых па сацыяльна-дэмаграфічных і іншых значных для даследавання прыкметах. Параўноўваючы паказчыкі размеркавання прыкмет ў розных групах, варта арыентавацца на магчымасць праверкі гіпотэз, сфармуляваных у праграме даследавання. У заключэнні трэба паказаць, ці пацвердзілася тая ці іншая гіпотэза, і зрабіць асноўныя высновы.

Вынікі аналізу і інтэрпрэтацыі даных сацыялагічнага даследавання выкладаюцца ў спецыяльных дакументах, такіх як **навуковая справаздача** або **аналітычны агляд**. Як правіла, у бібліятэках праводзяцца апісальныя і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аналітычныя даследаванні. У першым выпадку пішацца інфармацыйная запіска. Гэта апісанне вынікаў даследавання з некаторымі каментарамі, аднак без якіх-небудзь тлумачэнняў. У выпадку правядзення аналітычнага даследавання пішацца аналітычная запіска, вынікі навукова-даследчай працы афармляюцца ў выглядзе справаздачы аб навукова-даследчай рабоце (справаздачы аб НДР).

Галоўнае патрабаванне да гэтага жанру выкладання навуковых вынікаў заключаецца ў тым, што ён павінен утрымліваць усю значную інфармацыю, якая дазваляе ацаніць абгрунтаванасць высноў аўтара. Таму аўтар абавязаны прадставіць усе даныя, нават тыя з іх, якія, магчыма, і нязручныя для яго, не адпавядаюць яго тэарэтычнай канцэпцыі і мадэлі ўзаемасувязі пераменных.

Высновы даследчыкаў павінны даказаць праўдзівасць або памылковасць рабочых гіпотэз; даць рашэнне (пажадана, адназначнае і максімальна выразнае) пастаўленых у даследчай праграме задач; зафіксаваць гіпотэзы, якія не паддаліся праверцы, і нявырашаныя ў гэтай сувязі задачы ў выпадках, калі гэта мела месца (адмоўны вынік у навуцы таксама з'яўляецца навуковым фактам).

Справаздача афармляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі ДАСТ 7.32-2001 «Справаздача аб навукова-даследчай рабоце. Структура і правілы афармлення».

Вынікі сацыялагічных даследаванняў можна разглядаць як элемент распрацоўкі кіраўніцкіх рашэнняў, які ўзмацняе іх навуковую аснову і эмпірычнае абгрунтаванне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Васильев, И. Г. Социологические исследования в библиотеках : практическое пособие / И. Г. Васильев, М. Е. Илле, Д. К. Равинский. – Санкт-Петербург : Профессия, 2003. – 176 с.
2. Добреньков, В. И. Методы социологического исследования / В. И. Добреньков, А. И. Кравченко : учебник. – Москва : ИНФРА-М, 2004. – 768 с.
3. Качанова, Е. Ю. Исследовательская деятельность библиотек: назначение, теоретические основы, технология : учебно-практическое пособие / Качанова Елена Юрьевна ; М-во культуры Российской Федерации, ФГБОУ ВО «Хабаровский гос. ин-т культуры». – Хабаровск : Хабаровский гос. ин-т культуры, 2016. – 80 с.
4. Крейденко, В. С. Библиотечные исследования : учебно-методическое пособие / В. С. Крейденко. – Москва : Русская школьная библиотечная ассоциация, 2007. – 352 с.
5. Кулаков, П. А. Измерение в социологии : учебное пособие / П. А. Кулаков. – Новосибирск : НГАСУ, 2005. – 124 с.
6. Макеева, О. В. Социологические методы изучения пользователей: история и современное состояние / О. В. Макеева // Труды ГПНТБ СО РАН. – 2016. – № 10. – С. 272-281.
7. Мелентьева, Ю. П. Чтение, читатель, библиотека в изменяющемся мире / Ю. П. Мелентьева ; Нац. Центр исслед. истории кн. культуры. – Москва : Наука, 2007. – 355 с.
8. Опарина, О. Д. Организация научной деятельности библиотек в Интернете / О. Д. Опарина // Библиотековедение. – 2012. – № 5. – С. 30–37.
9. Самохина, М. М. Социолог в библиотеке, или Библиотекарь как социолог : Практическое пособие для тех, кто хочет и любит исследовать / М. М. Самохина. – Москва : Рос. гос. юнош. б-ка, 2008. – 194 с.
10. Сикевич, З. В. Социологическое исследование: практическое руководство / З. В. Сикевич. – Санкт-Петербург : Питер, 2005. – 320 с.
11. Смехнова, Г. П. Основы прикладной социологии : учебное пособие / Г. П. Смехнова. – Москва : Вузовский учебник, 2012. – 252 с.
12. Социологические исследования в библиотеке: подготовка, организация, проведение [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси ; сост. О. В. Бондарчук, А. С. Дубина, К. О. Францкевич ; ред.: М. Г. Пшыбытко и др. – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2018. – 1 электронный оптический диск (CD-ROM). – (БиблиоКонсультант).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. Стефановская, Н. А. Социологические исследования чтения: теория, методика, практика : научно-практическое пособие / Н. А. Стефановская. - Москва : Литера, 2013. – 143 с.

14. Тавокин, Е. П. Основы методики социологического исследования : учебное пособие / Е. П. Тавокин. – Москва : Инфра-М, 2017. — 239 с.

15. Трофимова, Р. А. Библиосоциология : История, теории, методология, исследовательские методы : автореферат дис. ... доктора социологических наук : 22.00.01 / Алт. гос. ун-т. – Барнаул, 2002. – 34 с.

16. Трофимова, Р. А. Основные направления социологических исследований отечественного библиотечного дела: к постановке вопроса о библиосоциологии / Р. А. Трофимова // Библиосфера. – 2005. – №2. – Режим доступа : https://cyberleninka.ru/article/n/osnovnye-napravleniya-sotsiologicheskih-issledovaniy-otechestvennogo-bibliotechnogo-dela-k-postanovke-voprosa-o-bibliosotsiologii. – Дата доступа : 17.02.2019.

17. Ядов, В. А. Стратегия социологического исследования. Описание, объяснение, понимание социальной реальности / В. А. Ядов. – 3-е изд., испр. – Москва : Омега-Л, 2007. – 567 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1. МЕТАДЫЧНЫЯ УКАЗАННІ ДА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

Пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў студэнты павінны вывучыць асноўную і дапаўняльную літаратуру па кожнаму пытанню, скласці разгорнутыя адказы па кожным пытанні.

Пры адказе на пытанне студэнт павінен прадэманстраваць добрае валоданне тэмай, паслядоўнасць, разуменне сутнасці пытання, уменне звязаць тэорыю з практыкай работы бібліятэкі, зрабіць высновы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.2. ТЭМАТЫКА СЕМІНАРАЎ

### СЕМІНАР № 1

па тэме **“Праграма сацыялагічнага даследавання і асноўныя этапы яго правядзення”,** 2 гадзіны

**Пытанні**

1. Структура праграмы сацыялагічнага даследавання, яе функцыі
2. Паняцце сацыяльнай праблемы і асноўныя спосабы яе выяўлення Суадносіны сацыялагічнай і бібліятэказнаўчай праблемы. Праблемная сітуацыя і яе абгрунтаванне
3. Вызначэнне аб’екта і прадмета даследавання, фармуліраванне мэты і задач. Суадносіны тэарэтычнага і эмпірычнага аб’ектаў даследавання
4. Асноўныя даследчыя стратэгіі ў сацыялогіі, іх прымяненне для даследвання бібліятэказнаўчых з’яў. Выбар даследчых стратэгій і іх спалучальнасць
5. Папярэдні сістэмны аналіз аб’екта даследавання. Пераменныя ў сацыялагічным даследаванні. Залежныя і незалежныя пераменныя
6. Вызначэнне і разгортванне гіпотэз даследавання. Вызначэнне асноўных метадаў і працэдур збора і аналіза зыходных даных
7. Асноўныя этапы правядзення бібліясацыялагічнага даследавання. Навуковая арганізацыя даследавання як умова атрымання дакладнай і надзейнай інфармацыі

*ЛІТАРАТУРА*

1. Добреньков, В. И Методы социологического исследования : учеб. по специальности 020300 "Социология" / В. И. Добреньков, А. И. Кравченко. – Москва : Инфра-М, 2009. – 767 с.

2. Бабосов, Е. М. Стратегия, программа и методы социологического исследования // Бабосов, Е. М. Общая социология : учеб. пособие. – 2-е изд., стер. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – С. 518–538.
3. Васильев, И. Г. Социологические исследования в библиотеках : практ. пособие / И. Г. Васильев, М. Е. Илле, Д. К. Равинский . – Санкт-Петербург : Профессия, 2001. – 176 с.
4. Ядов, В. А. Стратегия социологического исследования: Описание, объяснение, понимание соц. реальности : учеб. пособие / В. А. Ядов в сотрудничестве с В. В. Семеновой. – Москва : Академкнига : Добросвет, 2003. – 595 с.
5. Попова, И. П. Социология. Введение в специальность : учеб. для студ. вузов.– Киев : Тандем, 1997. – 287 с.
6. Самохина, М. М. Социолог в библиотеке, или Библиотекарь как социолог : практ. пособие / М.М. Самохина. – Москва : Рос. гос. юношес. б-ка, 2008. – 194 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СЕМІНАР № 2**

па тэме **“Методыка правядзення анкетнага апытання”,** 2 гадзіны

**Пытанні**

1. Спецыфіка і функцыі анкетавання
2. Віды анкетных пытанняў па ступені стандартызацыі; па канструктыўных асаблівасцях; па функцыях. Складаныя пытанні
3. Лагічная структура пытання. Асноўныя правілы фармуліроўкі пытанняў
4. Агульная кампазіцыя анкеты. Прынцыпы кампазіцыі анкеты
5. Метадычныя патрабаванні да анкеты
6. Працэдура лагічнага аналізу анкеты: адпаведнасць лагічным і сацыяльна-псіхалагічным крытэрам
7. Неабходныя ўмовы арганізацыі і паспяховага прымянення анкетавання
8. Тэхніка распаўсюджання і збора анкет

*ЛІТАРАТУРА*

1. Ядов, В. А. Стратегия социологического исследования: Описание, объяснение, понимание соц. реальности : учеб. пособие / В. А. Ядов в сотрудничестве с В. В. Семеновой. – Москва : Академкнига : Добросвет, 2003. – 595 с.

2. Васильев, И.Г. Социологические исследования в библиотеках : практ. пособие / И. Г. Васильев, М. Е. Илле, Д. К. Равинский . – Санкт-Петербург : Профессия, 2001. – 176 с.
3. Крейденко, В. С. Библиотечные исследования : учеб.-метод. пособие / В. С. Крейденко. – Москва : Русская школьная библиотечная ассоциация, 2007. – 351 с.
4. Проведение маркетинговых и социологических исследований в учреждениях культуры : (методические рекомендации) / Кировская гос. унив. обл. науч. б-ка им. А. И. Герцена, Науч.-методический отд. ; [сост. Н.А. Скрябина]. – Киров : Кировская гос. унив. обл. науч. б-ка им. А.И. Герцена, 2010. – 55 с.
5. Горшков, М. К. Прикладная социология: методология и методы : учеб. пособие / М. К. Горшков, Ф. Э. Шереги. – Москва : Альфа-М, 2009. – 414 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЕМІНАР № 3

па тэме **“Методыка інтэрв’ю. Выкарыстанне метаду фокус-груп у сацыялагічных даследаваннях бібліятэчнай дзейнасці”,** 2 гадзіны

### Пытанні

1. Вызначэнне і спецыфіка інтэрв’ю, перавагі і недахопы метаду
2. Віды інтэрв’ю: фармалізаванае, напаўфармалізаванае, нефармалізаванае
3. Этапы падрыхтоўкі і правядзення інтэрв’ю
4. Фокус-група, вызначэнне і сфера прымянення метаду
5. Асноўныя прынцыпы факусіраванага глыбіннага інтэрв’ю
6. Фарміраванне фокус-груп. Склад і колькасць удзельнікаў фокус-груп
7. Арганізацыя правядзення фокус-груп
8. Аналіз вынікаў работы фокус-групы

### *ЛІТАРАТУРА*

1. Васильев, И. Г. Социологические исследования в библиотеках : практ. пособие / И. Г. Васильев, М. Е. Илле, Д. К. Равинский . – Санкт-Петербург : Профессия, 2001. – 176 с.

2. Крейденко, В. С. Библиотечные исследования : учеб.-метод. пособие / В. С. Крейденко. – Москва : Русская школьная библиотечная ассоциация, 2007. – 351 с.
3. Горшков, М. К. Прикладная социология: методология и методы : учеб. пособие / М. К. Горшков, Ф. Э. Шереги. – Москва :Альфа-М, 2009. – 414 с.
4. Кузнецов, И. Н. Технологии социологического исследования : учеб.-метод. пособие / И. Н. Кузнецов. – Москва : МарТ, 2005. – 142 с.
5. Мельникова, О. Т. Фокус-группы: методы, методология, модерирование : учеб. пособие. – Москва : АспектПресс, 2007. – 318 с.

**СЕМІНАР № 4**

па тэме **“Экспертнае апытанне ў даследаванні бібліятэказнаўчых працэсаў і з’яў”,** 2 гадзіны

**Пытанні**

1. Апытанне экспертаў як метад збора сацыялагічнай інфармацыі. Умовы прымянення экспертнага апытання
2. Мэты, рэалізуемыя пры дапамозе метаду экспертных адзнак у бібліятэказнаўчым даследаванні
3. Віды экспертнага апытання
4. Асноўныя стадыі правядзення экспертных апытанняў
5. Праблема вымярэння: патрабаванні да шкал меркаванняў экспертаў
6. Збор экспертнай інфармацыі, яго працэдурныя асаблівасці. Метады апрацоўкі экспертных меркаванняў

*ЛІТАРАТУРА*

1. Васильев, И. Г. Социологические исследования в библиотеках : практ. пособие / И. Г. Васильев, М. Е. Илле, Д. К. Равинский . – Санкт-Петербург : Профессия, 2001. – 176 с.
2. Крейденко, В. С. Библиотечные исследования : учеб.-метод. пособие / В. С. Крейденко. – Москва : Русская школьная библиотечная ассоциация, 2007. – 351 с.
3. Горшков, М. К. Прикладная социология: методология и методы : учеб. пособие / М. К. Горшков, Ф. Э. Шереги. – Москва :Альфа-М, 2009. – 414 с.
4. Кузнецов, И. Н. Технологии социологического исследования : учеб.-метод. пособие / И. Н. Кузнецов. – Москва : МарТ, 2005. – 142 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Ядов, В. А. Стратегия социологического исследования: Описание, объяснение, понимание соц. реальности : учеб. пособие / В. А. Ядов в сотрудничестве с В. В. Семеновой. – Москва : Академкнига : Добросвет, 2003. – 595 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 4.1 МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ДА САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ МАГІСТРАНТАЎ

Студэнты самастойна вывучаюць прапанаваныя крыніцы і рыхтуюць адказы па пытаннях, з якімі выступаюць на семінарскіх занятках. Пры адказе неабходна вызначыць дасягненні, праблемы, зрабіць высновы.

## 4.2. ЗАДАННІ ДЛЯ КАНТРАЛЮЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

### ТЭМАТЫКА САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ МАГІСТРАНТАЎ

| № п/п | Тэма самастойнай работы | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1 | Асноўныя накірункі сучасных бібліясацыялагічных даследаванняў | 6 |
| 2 | Метадалагічныя асновы сацыялагічных аследаванняў бібліятэчнай дзейнасці | 4 |
| 3 | Праграма сацыялагічнага даследавання | 4 |
| 4 | Праграмныя патрабаванні да выбаркі і прынцыпы яе фарміравання | 4 |
| 5 | Вымярэнне сацыялагічных характарыстык аб’екта | 10 |
| 6 | Класіфікацыя метадаў збора сацыялагічнай інфармацыі і асаблівасці іх вакарыстання ў бібліятэказнаўстве | 2 |
| 7 | Методыка правядзення анкетнага апытання | 6 |
| 8 | Працэдура лагічнага аналізу анкеты | 6 |
| 9 | Экспертнае апытанне ў даследаванні бібліятэказнаўчых працэсаў і з’яў | 4 |
| | **Усяго** | **46** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 1. Асноўныя накірункі сучасных бібліясацыялагічных даследаванняў, 6 гадзін

**Заданне для СРС** – з выкарыстаннем электронных каталогаў бібліятэк і пошукавых магчымасцяў Інтэрнэт прывесці прыклады сацыялагічных даследаванняў у бібліятэках *за апошнія пяць гадоў* па вызначаных накірунках, занесці ў табліцу інфармацыю аб даследаваннях, падрыхтаваць адказы на прапанаваныя пытанні:

| Накірунак бібліясацыялагічнага даследавання | Тэмы даследаванняў | Арганізацыя, якая праводзіла даследаванне | Прозвішча даследчыкаў | Крыніца, у якой апублікаваны вынікі (БА*) |
|---|---|---|---|---|
| Вывучэнне чытання | 1.<br>2.<br>3. | | | |
| Даследаванне чытачоў універсальных (публічных) бібліятэк | 1.<br>2.<br>3. | | | |
| Даследаванне чытачоў спецыяльных бібліятэк | 1.<br>2.<br>3. | | | |
| Бібліятэчная камунікацыя. Узаемаадносіны бібліятэкараў і чытачоў. Бібліятэрапія. Канфліктагогія | 1.<br>2.<br>3. | | | |
| Бібліятэчны маркетынг. Імідж бібліятэкі | 1.<br>2.<br>3. | | | |
| Камплектаванне фондаў | 1.<br>2.<br>3. | | | |
| Каталагізацыя | 1. | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 2.<br>3. | | | |
| Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне | 1.<br>2.<br>3. | | | |
| Кіраванне бібліятэкай | 1.<br>2.<br>3. | | | |
| Кіраванне бібліятэчным персаналам | 1.<br>2.<br>3. | | | |
| Кіраванне бібліятэчнымі тэхналогіямі | 1.<br>2.<br>3. | | | |
| Бібліятэчная педагогіка | 1.<br>2.<br>3. | | | |
| Спецыяфіка бібліятэчнай прафесіі | 1.<br>2.<br>3. | | | |
| Іншае (раскрыць) | | | | |

* БА – бібліяграфічнае апісанне дакумента

*Пытанні для абмеркавання:*

1. Якія накірункі падаліся вам найбольш развітымі? З чым гэта звязана?
2. Якія накірункі бібліясацыялагічных даследаванняў адсутнічаюць у табліцы?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Прапануйце па кожнаму накірунку ўласныя тэмы даследаванняў, абгрунтуйце іх мэтазгоднасць
4. Ці можна устанавіць сувязь паміж арганізацыяй, якая праводзіла бібліясацыялагічнае даследаванне, і пэўным тэматычным накірункам даследавання? Раскройце ўзаемасувязь і патлумачце яе
5. Якія задачы выконваюць сацыялагічныя даследаванні ў бібліятэцы? У чым іх спецыфіка?
6. Сфармуліруйце аб'ект і прадмет бібліятэчнай сацыялогіі

**Форма кантролю СРС:** Субяседаванне па тэме, абмеркаванне ў групе

### Тэма 2. Метадалагічныя асновы сацыялагічных даследаванняў бібліятэчнай дзейнасці, 4 гадзіны

Заданне для СРС – з выкарыстаннем электронных каталогаў бібліятэк і пошукавых магчымасцяў Інтэрнэт зрабіце падборку з дзесяці аўтарэфератаў дысертацый па спецыяльнасці. Сфармуліруйце эмпірычны аб'ект і прадмет, залежныя і незалежныя пераменныя, гіпотэзы сацыялагічных даследаванняў, праведзеных у межах кожнай дысертацыйнай работы. У выпадку, калі сацыялагічнае даследаванне адсутнічае, абгрунтуйце мэтазгоднасць яго правядзення, сфармуліруйце аб'ект, прадмет, пераменныя, гіпотэзы.

Для выканання задання неабходна выкарыстоўваць матэрыялы лекцый па тэмах: "Метадалагічныя асновы сацыялагічных даследаванняў бібліятэчнай дзейнасці", "Праграма сацыялагічнага даследавання і асноўныя этапы яго правядзення" і наступную літаратуру:

1. Ядов, В. А. Стратегия социологического исследования: Описание, объяснение, понимание соц. реальности : учеб. пособие / В. А. Ядов в сотрудничестве с В. В. Семеновой. – Москва : Академкнига : Добросвет, 2003. – 595 с.

2. Бабосов, Е. М. Стратегия, программа и методы социологического исследования // Бабосов, Е. М. Общая социология : учеб. пособие. – 2-е изд., стер. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – С. 518–538.

3. Тавокин, Е. П. Основы методики социологического исследования / Е.П. Тавокин : учеб. пособие: для высш. учеб. заведений по специальности 040201 "Социология". – Москва : Инфра-М, 2009. – 236 с.

Форма кантролю СРС: Субяседаванне па тэме, абмеркаванне ў групе



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 3. Праграма сацыялагічнага даследавання, 4 гадзіны.

**Заданне для СРС** – распрацаваць метадалагічны блок праграмы сацыялагічнага даследавання па абранай тэме (ці тэме магістарскай дысертацыі).

1. Назавіце тэму бібліясацыялагічнага даследавання
2. Абгрунтуйце мэтазгоднасць яго правядзення
3. Сфармуліруйце праблему, эмпірычны аб’ект і прадмет даследавання
4. Вызначце залежныя і незалежныя пераменныя
5. Сфармуліруйце гіпотэзу (гіпотэзы) даследавання
6. Абгрунтуйце выбар даследчых стратэгій і іх спалучальнасць
7. Назавіце сродкі забеспячэння надзейнасці і дакладнасці даследавання
8. Установіце і абгрунтуйце аптымальныя метады збора даных

Для выканання задання неабходна выкарыстоўваць матэрыялы лекцый па тэмах: “Метадалагічныя асновы сацыялагічных даследаванняў бібліятэчнай дзейнасці”, “Праграма сацыялагічнага даследавання і асноўныя этапы яго правядзення” і наступную літаратуру:

1. Ядов, В. А. Стратегия социологического исследования: Описание, объяснение, понимание соц. реальности : учеб. пособие / В. А. Ядов в сотрудничестве с В. В. Семеновой. – Москва : Академкнига : Добросвет, 2003. – 595 с.

2. Горшков, М. К. Прикладная социология: методология и методы : учеб. пособие / М. К. Горшков, Ф. Э. Шереги. – Москва : Альфа-М, 2009. – 414 с.

3. Готлиб, А. С. Введение в социологическое исследование. Качественный и количественный подходы. Методология. Исследовательские практики : учеб. пособие по социологии для студ. вузов / А. С. Готлиб. – Москва : Флинта, 2005. – 382 с.

**Форма кантролю СРС:** Субяседаванне па тэме, абмеркаванне ў групе, мазгавы штурм

### Тэма 4. Праграмныя патрабаванні да выбаркі і прынцыпы яе фарміравання, 4 гадзіны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Заданне для СРС** – выкарыстоўваючы падборку аўтарэфератаў дысертацый па спецыяльнасці (тэма 2), падрыхтуйце праект выбаркі для пяці сацыялагічных даследаванняў шляхам адказу на наступныя пытанні:

1. Які эмпірычны аб’ект даследавання?
2. Даследаванне з’яўляецца суцэльным ці выбарачным?
3. Калі яно з’яўляецца выбарачным, ці прэтэндуе яно на рэпрэзентатыўнасць?
4. Калі яно прэтэндуе на рэпрэзентатыўнасць, то якая генеральная сукупнасць?
5. Колькі ступеняў адбора выкарыстоўваецца ў выбарцы?
6. Якая адзінка абдора на кожнай ступені?
7. Якая стратэгія адбора (від адбора) на кожнай ступені?
8. Якая канкрэтна разнавіднасць выпадковага адбора прымяняецца?
9. Якія параметры выкарыстоўваюцца пры квотнай выбарцы?
10. Што з’яўляецца асновай выбаркі (картатэка, спіс, карта і г.д.)?
11. Якая адзінка назірання на апошняй ступені адбора?
12. Які аб’ем выбаркі і як ён разлічваецца?

Для выканання работы неабходна вывучыць тэму “Праграмныя патрабаванні да выбаркі і прынцыпы яе фарміравання” па канспектах лекцый, а таксама па вучэбных дапаможніках:


1. Добреньков В. И. Методы социологического исследования : учеб. / Добреньков В. И., Кравченко А. И. — Москва : ИНФРА-М, 2004. — 768 с. — (Классический университетский учебник).
2. Ядов, В. А. Стратегия социологического исследования: Описание, объяснение, понимание соц. реальности : учеб. пособие / В .А. Ядов в сотрудничестве с В. В. Семеновой. – Москва : Академкнига : Добросвет, 2003. – 595 с.
3. Горшков, М. К. Прикладная социология: методология и методы : учеб. пособие / М. К. Горшков, Ф. Э. Шереги. – Москва :Альфа-М, 2009. – 414 с.
4. Готлиб, А. С. Введение в социологическое исследование. Качественный и количественный подходы. Методология. Исследовательские практики : учеб. пособие по социологии для студ. вузов / А. С. Готлиб. – Москва : Флинта, 2005. – 382 с.
5. Гуц, А. К. Математические методы в социологии / А. К. Гуц, Ю. В. Фролова. – Москва : Изд-во ЛКИ, 2007. – 216 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Форма кантролю СРС:** Субяседаванне па тэме, абмеркаванні ў мінігрупах, мазгавы штурм

### Тэма 5. Вымярэнне сацыялагічных характарыстык аб’екта, 10 гадзін

**Заданне для СРС** – правесці аперацыяналізацыю паняццяў па абранай тэме (тэме магістарскай дысертацыі), ажыццявіць першасны сістэмны аналіз аб’екта даследавання, пабудаваць індэксы, сфарміраваць эмпірычныя індыкатары, распрацаваць шкалы вымярэння.

Работа складаецца з трох частак.

**Ч.1** выконваецца па наступнай схеме:

1) Пералічыце паняцці, якія адлюстроўваюць аб’ект, прадмет, праблему вашага даследавання.
2) Вызначце, якія з іх базавыя, якія падначаленыя, якія роднасныя. Прадстаўце вынікі ў табліцы, дзе для кожнага базавага паняцця вызначаны падначаленыя і роднасныя.
3) Дайце азначэнні базавых, падначалены, роднасных паняццяў вашага даследавання.
4) Правядзіце аперацыяналізацыю базавых паняццяў, састаўце тэарэтычную схему аперацыяналізацыі:

| № п/п | Зыходнае паняцце | Паняційныя індыкатары | | | Эмпірычныя індыкатары |
|---|---|---|---|---|---|
| | | I ступені | II ступені | III ступені | |
| | | | | | 1.<br>2.<br>3.<br>4.<br>... |
| | | | | | |
| | | | | | |

**Ч.2** выконваецца па наступнай схеме:

1) Правядзіце першасны сістэмны аналіз аб’екта даследавання:

а) вызначце кампанентную структуру аб'екта (састаўныя элементы, з чаго яны складаюцца, характар узаемасувязі паміж элементаў), вынікі занясіце ў табліцу;
б) вызначце унутраныя і знешнія, суб'ектыўныя і аб'ектыўныя, агульныя і спецыфічныя фактары, якія ўздзейнічаюць на развіццё аб'екта, занясіце вынікі ў табліцу;
в) апішыце магчымыя стратэгіі развіцця аб'екта.
2) Распрацуйце сістэму паказчыкаў для вымярэння аб'екта вашага даследавання па схеме "паказчык – працягласць – індэкс", вынікі занясіце ў табліцу, напрыклад, для даследавання ўплыву інфармацыйнай культуры асобы на ўзровень агульнапрафесійнай кампетэнтнасці:

| Формы праяўлення (паказчыкі) | Ступень праяўлення | Індэкс |
|---|---|---|
| Асэнсаванасць працэсу інфармацыйнага пошуку | Кожнага этапу працэсу<br>Асноўных этапаў<br>Некаторых этапаў | 3<br>2<br>1 |
| Выкарыстанне прафесійных інфармацыйна-пошукавых сістэм | Сістэматычнае, мэтанакіраванае<br>Мэтанакіраванае, але не сістэматычнае<br>Эпізадычнае | 3<br>2<br>1 |
| | і г.д. | |

3) Распрацуйце эмпірычныя індыкатары для фіксацыі выдзеленых паказчыкаў, вынікі занясіце ў табліцу.

**Ч.3** выконваецца па наступнай схеме:
1) Супастаўце эмпірычныя індыкатары, распрацаваныя ў Ч.1 і Ч.2 дадзенай работы. Сфарміруйце адзіную мадэль вывучэння ўласцівасцей аб'екта, якая складаецца з агульных паказчыкаў вымярэння, вызначэння іх працягласці і эмпірычных індыкатараў для кожнага паказчыка. Вынікі занясіце ў табліцу.
2) Распрацуйце шкалы вымярэння выдзеленых паказчыкаў:
   а) намінальную неўпарадкаваную;
   б) намінальную часткова ўпарадкаваную;
   в) парадкавую (рангавую);
   г) інтэрвальную;
   д) шкалу прапарцыянальных ацэнак;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

е) ацэначную вербальную;

ж) ацэначную графічную.

3) Падрыхтуйце для абмеркавання на семінары: а) выніковую табліцу тэарэтычнай і эмпірычнай аперацыяналізацыі паняццяў, б) табліцу агульных паказчыкаў вымярэння з указаннем іх працягласці і эмпірычных індыкатараў да кожнага паказчыка; в) распрацаваныя шкалы кожных відаў.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Кулаков, П. А. Измерение в социологии : учеб. пособие / П. А. Кулаков. – Новосибирск : НГАСУ, 2005. – 124 с.
2. Ядов, В. А. Стратегия социологического исследования: Описание, объяснение, понимание соц. реальности : учеб. пособие / В. А. Ядов в сотрудничестве с В. В. Семеновой. – Москва : Академкнига : Добросвет, 2003. – 595 с.
3. Тавокин, Е. П. Основы методики социологического исследования / Е. П. Тавокин : учеб. пособие: для высш. учеб. заведений по специальности 040201 "Социология". – Москва : Инфра-М, 2009. – 236 с.
4. Осипов, Г. В. Методы измерения в социологии / Г. В. Осипов. – Москва : Наука, 2003. – 106 с.
5. Толстова, Ю. Н. Измерение в социологии : учеб. пособие / Ю. Н. Толстова. – Москва: Университет, 2009. – 291 с.
6. Кулаков, П. А. Измерение в социологии : учеб. пособие / П. А. Кулаков. – Новосибирск, НГАСУ, 2005. – 124 с.


**Форма кантролю СРС:** Субяседаванне па тэме, групавыя абмеркаванні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 6. Класіфікацыя метадаў збора сацыялагічнай інфармацыі і асаблівасці іх вакарыстання ў бібліятэказнаўстве, 2 гадзіны

**Заданне для СРС** – састаўце класіфікацыйную схему “Метады бібліясацыялагічных даследаванняў”. У класіфікацыю ўключыце тэарэтычныя і эмпірычныя метады даследаванняў.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Готлиб, А. С. Введение в социологическое исследование. Качественный и количественный подходы. Методология. Исследовательские практики :

учеб. пособие по социологии для студ. вузов / А. С. Готлиб. – Москва : Флинта, 2005. – 382 с.
2. Ядов, В. А. Стратегия социологического исследования: Описание, объяснение, понимание соц. реальности : учеб. пособие / В. А. Ядов в сотрудничестве с В. В. Семеновой. – Москва : Академкнига : Добросвет, 2003. – 595 с.
3. Горшков, М. К. Прикладная социология: методология и методы : учеб. пособие / М. К. Горшков, Ф. Э. Шереги. – Москва : Альфа-М, 2009. – 414 с.
4. Девятко, И. Ф. Методы социологического исследования : учебное пособие: для высших учебных заведений по специальности 040201 "Социология" и 040102 "Социальная антропология" / И. Ф. Девятко. – Москва : Книжный дом, 2006. – 293 с.

**Форма кантролю СРС:** Групавое абмеркаванне

### Тэма 7. Методыка правядзення анкетнага апытання, 6 гадзін

**Заданне для СРС –** з выкарыстаннем уласных даследчых праграм і табліц, распрацаваных у тэме 5, падрыхтаваць анкету для правядзення апытання па тэме магістарскага даследавання.

Анкета павінна ўключаць уступную, базісную, заключную часткі і наступныя віды пытанняў:

1) *Па стандартызацыі:*

1а) закрытыя

1б) напаўзакрытыя

1в) адкрытыя

2) *Па канструктыўных асаблівасцях*:

2а) дыхатамічныя

2б) альтэрнатыўныя

2в) паліварыянтныя

3) *Па функцыях*:

3а) фільтры

3б) кантрольныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3в) пасткі

*ЛІТАРАТУРА*


1. Ядов, В. А. Стратегия социологического исследования: Описание, объяснение, понимание соц. реальности : учеб. пособие / В. А. Ядов в сотрудничестве с В. В. Семеновой. – Москва : Академкнига : Добросвет, 2003. – 595 с.
2. Васильев, И. Г. Социологические исследования в библиотеках : практ. пособие / И. Г. Васильев, М. Е. Илле, Д. К. Равинский . – Санкт-Петербург : Профессия, 2001. – 176 с.
3. Крейденко, В. С. Библиотечные исследования : учеб.-метод. пособие / В. С. Крейденко. – Москва : Русская школьная библиотечная ассоциация, 2007. – 351 с.
4. Проведение маркетинговых и социологических исследований в учреждениях культуры : (методические рекомендации) / Кировская гос. унив. обл. науч. б-ка им. А. И. Герцена, Науч.-методический отд. ; [сост. Н. А. Скрябина]. – Киров : Кировская гос. унив. обл. науч. б-ка им. А.И. Герцена, 2010. – 55 с.
5. Горшков, М. К. Прикладная социология: методология и методы : учеб. пособие / М. К. Горшков, Ф. Э. Шереги. – Москва :Альфа-М, 2009. – 414 с.


**Форма кантролю СРС:** Субяседаванне па тэме, групавое абмеркаванне, мазгавы штурм

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 8. Працэдура лагічнага аналізу анкеты, 6 гадзін

**Заданне для СРС** – прааналізаваць падрыхтаваную магістрантам анкету на адпаведнасць лагічным і сацыяльна-псіхалагічным крытэрам. Магістранты абменьваюцца анкетамі падрыхтаванымі да тэмы 7 і выконваюць іх лагічны аналіз. Вынікі аналізу выкладаюцца пісьмова і абмяркоўваюцца на семінары.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Ядов, В. А. Стратегия социологического исследования: Описание, объяснение, понимание соц. реальности : учеб. пособие / В. А. Ядов в сотрудничестве с В. В. Семеновой. – Москва : Академкнига : Добросвет, 2003. – 595 с.

2. Васильев, И. Г. Социологические исследования в библиотеках : практ. пособие / И. Г. Васильев, М. Е. Илле, Д. К. Равинский . – Санкт-Петербург : Профессия, 2001. – 176 с.
3. Крейденко, В. С. Библиотечные исследования : учеб.-метод. пособие / В. С. Крейденко. – Москва : Русская школьная библиотечная ассоциация, 2007. – 351 с.
4. Проведение маркетинговых и социологических исследований в учреждениях культуры : (методические рекомендации) / Кировская гос. унив. обл. науч. б-ка им. А. И. Герцена, Науч.-методический отд. ; [сост. Н. А. Скрябина]. – Киров : Кировская гос. унив. обл. науч. б-ка им. А.И. Герцена, 2010. – 55 с.
5. Горшков, М. К. Прикладная социология: методология и методы : учеб. пособие / М. К. Горшков, Ф. Э. Шереги. – Москва :Альфа-М, 2009. – 414 с.

**Форма кантролю СРС:** групавое абмеркаванне

## Тэма 9. Экспертнае апытанне ў даследаванні бібліятэказнаўчых працэсаў і з'яў, 4 гадзін

**Заданне для СРС** – вызначыць экспертаў па сваіх даследчых тэмах і распрацаваць экспертнае інтэрв'ю. Работа выконваецца па схеме:

1) Тэма даследавання, эмпірычны аб'ект даследавання;
2) Мэты, рэалізуемыя пры дапамозе метаду экспертных адзнак;
3) Абраны від экспертнага апытання, аргументацыя;
4) Прынцыпы адбору экспертаў;
5) Эксперты з указаннем месца работы, пасады, стажу і інш.;
6) Метад збора экспертнай інфармацыі;
7) Распрацаваны бланк для правядзення экспертнага інтэрв'ю

*ЛІТАРАТУРА*

1. Васильев, И. Г. Социологические исследования в библиотеках : практ. пособие / И. Г. Васильев, М. Е. Илле, Д. К. Равинский . – Санкт-Петербург : Профессия, 2001. – 176 с.
2. Крейденко, В. С. Библиотечные исследования : учеб.-метод. пособие / В. С. Крейденко. – Москва : Русская школьная библиотечная ассоциация, 2007. – 351 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Горшков, М. К. Прикладная социология: методология и методы : учеб. пособие / М. К. Горшков, Ф. Э. Шереги. – Москва : Альфа-М, 2009. – 414 с.
4. Кузнецов, И. Н. Технологии социологического исследования : учеб.-метод. пособие / И. Н. Кузнецов. – Москва : МарТ, 2005. – 142 с.
5. Ядов, В. А. Стратегия социологического исследования: Описание, объяснение, понимание соц. реальности : учеб. пособие / В. А. Ядов в сотрудничестве с В. В. Семеновой. – Москва : Академкнига : Добросвет, 2003. – 595 с.

**Форма кантролю СРС:** Субяседаванне па тэме, групавое абмеркаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.3. ГРАФІК КАНТРОЛЮ ЗА САМАСТОЙНАЙ РАБОТАЙ МАГІСТРАНТАЎ

| № п/п | Тэмы для кантролю па СРС | Формы кантролю | Тэрмін правядзення |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1. | Асноўныя накірункі сучасных бібліясацыялагічных даследаванняў | субяседаванне | 4 тыдзень |
| 2. | Метадалагічныя асновы сацыялагічных аследаванняў бібліятэчнай дзейнасці | субяседаванне, групавое абмеркаванне | 6 тыдзень |
| 3. | Праграма сацыялагічнага даследавання | субяседаванне | 8 тыдзень |
| 4. | Праграмныя патрабаванні да выбаркі і прынцыпы яе фарміравання | групавое абмеркаванне, мазгавы штурм | 9 тыдзень |
| 5. | Вымярэнне сацыялагічных характарыстык аб’екта | групавое абмеркаванне, мазгавы штурм | 11 тыдзень |
| 6. | Класіфікацыя метадаў збора сацыялагічнай інфармацыі і асаблівасці іх вакарыстання ў бібліятэказнаўстве | субяседаванне | 12 тыдзень |
| 7. | Методыка правядзення анкетнага апытання | субяседаванне | 13 тыдзень |
| 8. | Працэдура лагічнага аналізу анкеты | субяседаванне, групавое абмеркаванне | 14 тыдзень |
| 9. | Экспертнае апытанне ў даследаванні бібліятэказнаўчых працэсаў і з’яў | субяседаванне | 15 тыдзень |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.4. ПЫТАННІ ДЛЯ САМАПРАВЕРКІ ВЕДАЎ

*Па тэме 1 “Бібліясацыялогія як міждысцыплінарная галіна ведаў: гісторыя і сучаснасць”:*

1. Калі пачалося сацыялагічнае вывучэнне праблем бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, кнігазнаўства?
2. Якія асноўныя накірункі бібліясацыялагічных даследаванняў?
3. Як прымяняюцца сацыялагічныя даследаванні пры вывучэнні праблем фарміравання і выкарыстання бібліятэчных фондаў; развіцця інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі; арганізацыі і кіравання бібліятэчнай дзейнасцю; дыягностыкі інфармацыйных патрэб карыстальнікаў бібліятэк; вывучэння чытання?
4. Якія задачы сацыялагічных даследаванняў у бібліятэцы?
5. Які аб’ект і прадмет бібліясацыялогіі?

*Па тэме 2 “Метадалагічныя асновы сацыялагічных даследаванняў бібліятэчнай дзейнасці”:*

1. Якія метадалагічныя падыходы ў сацыялогіі вы ведаеце?
2. Чаму неабходна распрацоўваць метадалагічную аснову даследавання?
3. Прывядзіце прыклады выкарыстання паводзінавага і інстытуцыянальнага, аб’ектыўна-прадметнага і суб’ектыўна-каштоўнаснага, функцыяналісцкага і канфліктнага падыходаў у бібліясацыялагічных даследаваннях.
4. Ці могуць розныя метадалагічныя падыходы спалучацца ў межах аднаго даследавання?
5. Што такое сацыяльны факт? Як суадносяцца паняцці “сацыяльны факт” і “статыстычны факт”?
6. Як забяспечваецца абгрунтаванасць і дакладнасць сацыялагічных ведаў?
7. Назавіце асноўныя прынцыпы бібліясацыялагічных даследаванняў і патлумачце іх.
8. Якія віды сацыялагічных даследаванняў вы ведаеце? Патлумачце сутнасць кожнага з іх.

*Па тэме 3 “Праграма сацыялагічнага даследавання і асноўныя этапы яго правядзення”:*

1. Чаму неабходна складаць праграму сацыялагічнага даследавання?
2. Якія элементы ўключаюць тэарэтычны і эмпірычны блокі праграмы?
3. Што такое аб’ект, прадмет, мэта, задачы даследавання?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. У чым розніца паміж сацыялагічнай праблемай і праблемнай сітуацыяй?
5. Што такое гіпотэза?
6. Якія віды гіпотэз вы ведаеце?
7. Патлумачце сутнасць залежных і незалежных пераменных.
8. Якія асноўныя этапы правядзення бібліясацыялагічнага даследавання?

*Па тэме 4 "Праграмныя патрабаванні да выбаркі і прынцыпы яе фарміравання":*

1. Што такое выбарачнае даследаванне?
2. Патлумачце паняцці генеральнай і выбарачнай сукупнасці.
3. Што такое рэпрэзентатыўнасць і якім чынам яна дасягаецца?
4. Як разлічваецца аб'ём выбаркі?
5. Што такое памылка выбаркі?
6. Якія віды імавернасных выбарак вы ведаеце?
7. Назавіце прынцыпы фарміравання імавернасных выбарак.
8. Чым адрозніваюцца імавернасныя і мэтанакіраваныя выбаркі?
9. Назавіце прынцыпы фарміравання мэтанакіраваных выбарак.
10. Пералічыце тыповыя памылкі пры фарміраванні выбаркі і спосабы яе карэкцыі.

*Па тэме 5 "Вымярэнне сацыялагічных характарыстык аб'екта":*

1. Патлумачце паняцце вымярэння ў сацыялогіі.
2. З якіх этапаў складаецца вымяральная працэдура?
3. У чым сутнасць прамога і ўскоснага вымярэнняў?
4. Якія метады прамога і ўскоснага вымярэння вы ведаеце? Патлумачце іх сутнасць.
5. Што такое аперацыяналізацыя паняццяў? У чым розніца паміж тэарэтычнай і эмпірычнай аперацыяналізацыяй?
6. Якая методыка аперацыяналізацыі паняццяў?
7. Што ўключае першасны сістэмны аналіз аб'екта і з якой мэтай ён праводзіцца?
8. Што такое эмпірычны індыкатар?
9. Што ўключае працэдура шкаліравання?
10. Якія віды шкал вы ведаеце? Патлумаце сутнасць кожнай з іх.
11. Якія асноўныя патрабаванні да шкал?

*Па тэме 6 "Класіфікацыя метадаў збора сацыялагічнай інфармацыі і асаблівасці іх выкарыстання ў бібліятэказнаўстве":*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Якая розніца паміж колькаснымі і якаснымі метадамі у сацыялогіі?
2. Пералічыце колькасныя і якасныя сацыялагічныя метады.
3. Якія магчымасці і абмежаванні для прымянення колькасных і якасных метадаў у бібліясацыялагічным даследаванні?
4. Патлумачце сутнасць метаду назірання, яго перавагі і недахопы.
5. У чым спецыфіка бібліятэчнага назірання?
6. Якая методыка назірання?
7. Якія метады аналізу дакументных крыніц вы ведаеце? У чым іх спецыфіка?
8. Раскрыйце методыку кантэнт-аналізу.
9. Калі прымяняецца сацыялагічны эксперымент?
10. Якія віды сацыялагічнага эксперыменту вы ведаеце?
11. Якая лагічная структура эксперыменту?
12. Назавіце апытальныя метады ў сацыялогіі. У чым іх сутнасць? Як яны прымяняюцца для даследавання бібліятэчных працэсаў і з'яў?

*Па тэме 7 "Методыка правядзення анкетнага апытання":*

1. У чым спецыфіка анкетавання? Якія магчымасці і абмежаванні дадзенага метаду?
2. Раскрыйце пазнавальныя магчымасці анкетнага пытання і яго функцыі.
3. Якая лагічная структура пытання?
4. Якія вызначаюцца віды анкетных пытанняў па ступені стандартызацыі; па канструктыўных асаблівасцях; па функцыях?
5. У чым сутнасць складаных пытанняў і калі яны прымяняюцца?
6. Назавіце асноўныя правілы фармуліроўкі пытанняў.
7. Як звязаны анкетныя пытанні і колькасць рэспандэнтаў?
8. Якая кампазіцыя анкеты?
9. Раскрыйце прынцыпы кампазіцыі анкеты.
10. Якія метадычныя патрабаванні да анкеты?
11. Раскрыйце працэдуру лагічнага аналізу анкеты.
12. Як стварыць анкету ў сетцы Інтэрнэт?
13. Якія неабходныя ўмовы арганізацыі і паспяховага прымянення анкетавання?

*Па тэме 8 "Методыка інтэрв'ю. Выкарыстанне метаду фокус-груп у сацыялагічных даследаваннях бібліятэчнай дзейнасці":*

1. У чым спецыфіка метаду інтэрв'ю?
2. Раскрыйце перавагі і недахопы дадзенага метаду.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Чым адрозніваюцца фармалізаванае, напаўфармалізаванае, нефармалізаванае інтэрв'ю?
4. Якія этапы падрыхтоўкі і правядзення інтэрв'ю?
5. Што такое "эфект інтэрв'юрэра" і якія існуюць спосабы яго мінімізацыі?
6. Дайце вызначэнне метаду фокус-груп.
7. Якая сфера прымянення дадзенага метаду?
8. Назавіце асноўныя прынцыпы факусіраванага глыбіннага інтэрв'ю.
9. Якая методыка правядзення фокус-груп?
10. У чым заключаюцца функцыі мадэратара?
11. Як аналізуюцца вынікі работы фокус-груп?

*Па тэме 9 "Экспертнае апытанне ў даследаванні бібліятэказнаўчых працэсаў і з'яў":*

1. У чым сутнасць метаду экспертнага апытання?
2. Якія ўмовы прымянення дадзенага метаду для даследавання бібліятэказнаўчых працэсаў і з'яў? Якія мэты пры гэтым рэалізуюцца?
3. Якія віды экспертнага апытання вы ведаеце?
4. Раскройце асноўныя стадыі правядзення экспертных апытанняў.
5. Якімі правіламі трэба карыстацца пры адборы экспертаў?
6. У чым перавагі працэдур са зваротнай сувяззю без непасрэднага ўзаемадзеяння экспертаў?
7. Патлумачце сутнасць метаду Дэльфі; метаду якаснай зваротнай сувязі; метаду індывідуальнай зваротнай сувязі.
8. Якія фактары валіднасці экспертных ацэнак?
9. Як вядзецца апрацоўка экспертных меркаванняў?

*Па тэме 10 "Абагульненне і аналіз вынікаў сацыялагічнага даследавання":*

1. Якія вы ведаеце віды аналіза даных, якія выкарыстоўваюцца ў бібліясацыялагічным даследаванні?
2. Чым адрозніваецца статыстычны і нестатыстычны аналіз?
3. Патлумачце сутнасць функцыянальнага, структурнага, генетычнага, сістэмнага аналізу.
4. Якія этапы і працэдуры першаснага аналізу анкетных даных?
5. Якое праграмнае забеспячэнне выкарыстоўваецца пры камп'ютэрнай апрацоўцы сацыялагічнай інфармацыі?
6. Якая методыка статыстычнай апрацоўкі і аналіза даных?
7. Што такое частотнае размеркаванне? Якія віды чатсот вы ведаеце?
8. Якія вы ведаеце віды нестатыстычнай апрацоўкі даных?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. Што такое табліцы спалучэнняў і як яны будуюцца?
10. Як праводзіцца аналіз адкрытых пытанняў?
11. Што такое латэнтна-структурны аналіз і якая яго методыка?
12. У чым спецыфіка дыскрымінантнага, кластэрнага, фактарнага аналізу? Якая методыка яго правядзення?
13. Як праводзіцца аналіз даных, вымераных па парадкавых і намінальных шкалах?
14. У чым спецыфіка абгрунтавання вынікаў бібліясацыялагічнага даследавання?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.5. Пытанні да заліку

1. Бібліясацыялогія як міждысцыплінарная галіна ведаў
2. Сучасныя накірункі сацыялагічных даследаванняў бібліятэчнай дзейнасці
3. Метадалагічныя падыходы ў сацыялогіі, іх узгadненне ў межах канкрэтнага сацыялагічнага даследавання
4. Абгрунтаванасць і дакладнасць сацыялагічных ведаў
5. Прынцыпы бібліясацыялагічнага даследавання
6. Праграма сацыялагічнага даследавання
7. Асноўныя этапы сацыялагічнага даследавання
8. Віды выбарак і прынцыпы іх фарміравання
9. Аб'ём выбаркі і метады яго разліку
10. Тыпавыя памылкі пры фарміраванні выбаркі і спосабы яе карэкцыі
11. Прамое і ўскоснае вымярэнне
12. Вымяральная працэдура
13. Асноўныя віды шкал і спосабы іх пабудовы
14. Колькасныя і якасныя метады збора даных, іх магчымасці і абмежаванні
15. Неапытальныя метады збора першасных даных
16. Апытальныя метады
17. Методыка анкетавання
18. Віды анкетных пытанняў і правілы іх фармуліроўкі
19. Агульная кампазіцыя анкеты
20. Працэдура лагічнага аналізу анкеты
21. Віды інтэрв'ю і методыка яго правядзення
22. Інтэрв'ю як працэс сацыяльна-псіхалагічнага ўзаемадзеяння інтэрв'юэра з рэспандэнтам
23. Асаблівасці фіксавання, апрацоўкі і аналіза інфармацыі, атрыманай метадам інтэрв'ю
24. Асноўныя прынцыпы факусіраванага глыбіннага інтэрв'ю
25. Арганізацыя правядзення фокус-груп
26. Аналіз вынікаў работы фокус-групы
27. Апытанне экспертаў як метад збора сацыялагічнай інфармацыі. Віды экспертнага апытання
28. Асноўныя стадыі правядзення экспертных апытанняў
29. Працэдурныя асаблівасці этапу збора экспертнай інфармацыі
30. Статыстычныя метады апрацоўкі і аналіза даных
31. Нестатыстычныя метады апрацоўкі і аналізу даных
32. Якасны аналіз сацыялагаічных даных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.6. Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці магістрантаў

Для выяўлення ўзроўню вучэбных дасягненняў магістрантаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя сродкі дыягностыкі:

- ✓ стандартныя заданні па асноўных раздзелах курса (складанне праграмы даследавання, фарміраванне абгрунтаванай выбаркі, планаванне вымяральных працэдур і правядзенне шкаліравання, састаўленне анкеты, аналіз першасных даных);
- ✓ праблемныя заданні living рознага ўзроўню складанасці па асноўных раздзелах курса і па дысцыпліне цалкам;
- ✓ групавыя абмеркаванні тэарэтычных і практычных пытанняў курса;
- ✓ разлікова-графічныя работы;
- ✓ распрацоўкі класіфікацыйных схем;
- ✓ выступленні на семінарах-даследаваннях, семінарах-дыскусіях;
- ✓ праверка якасці выканання самастойных работ і правядзенне іх групавых абмеркаванняў;
- ✓ правядзенне лагічнага аналізу анкеты, распрацаванай іншым магістрантам (работа ў мінігрупе), пад кантролем выкладчыка;
- ✓ планаванне і пробная рэалізацыя метадалагічнай, метадычнай і працэдурнай часткі сацыялагічнага даследавання па тэме магістарскай дысертацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.7. Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

| Балы | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Адсутнасць прырашчэння кампетэнцый у межах вывучаемага курса, адмаўленне ад адказу. |
| 2 (два) | Фрагментарныя веды ў межах курса; няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію дысцыпліны (паняццяў сацыяльнага і статыстычнага факта, залежнай і незалежнай пераменных, выбаркі, шкалы, эмпірычнага  індыкатара, кадавання, сацыялагічнага індэкса і г.д.); наяўнасць у адказе грубых і лагічных памылак; некампетэнтнасць пры вырашэнні стандартных задач (распрацоўка анкеты са стандартнымі тыпамі пытанняў, разлік імавернаснай, мэтанакіраванай і камбінаванай выбаркі, пабудова шкал і г.д.); пасіўнасць на практычных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 3 (тры) | Недастаткова поўны аб'ём ведаў па курсу; веданне некаторых асноўных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай дысцыпліны; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (паняццяў сацыяльнага і статыстычнага факта, залежнай і незалежнай пераменных, выбаркі, шкалы, эмпірычнага  індыкатара, кадавання, сацыялагічнага індэкса і г.д.), аднак выкладанне адказу з істотнымі памылкамі; веданне асноўных апытальных метадаў, якія выкарыстоўваюцца ў бібліясацыялагічным даследаванні, аднак слабое валоданне канкрэтнымі тэхнікамі і працэдурамі даследавання; грубыя памылкі пры вырашэнні стандартных задач (распрацоўка анкеты са стандартнымі тыпамі пытанняў, разлік імавернаснай, мэтанакіраванай і камбінаванай выбаркі, пабудова шкал і г.д.); пасіўнасць на практычных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 4 (чатыры) | Дастатковы аб'ём ведаў у межах курса; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; уменне арыентавацца ў асноўных метадалагічных канцэпцыях сацыялогіі, вызначаць праблему, аб'ект і прадмет даследавання, фармуліраваць яго мэту і задачы, залежныя і незалежныя пераменныя, гіпотэзы; веданне розных відаў выбарак і прынцыпаў іх фарміравання; |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | уменне праводзіць папярэдні сістэмны аналіз аб'екта даследавання і вызначаць метады збору інфармацыі; уменне выбіраць шкалы вымярэння і распрацоўваць іх, складаць анкету ў адпаведнасці з метадычнымі патрабаваннямі, праводзіць апытанне, апрацоўваць атрыманыя даныя; выкананне стандартных задач з неістотнымі памылкамі; дапушчальны ўзровень культуры выканання практычных заданняў. |
| 5 (пяць) | Дастатковы аб'ём ведаў у межах курса; лагічнае і правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць высновы і даваць ацэнкі; добрае валоданне навуковай тэрміналогіяй і інструментарыем дысцыпліны; вырашэнне стандартных задач з выкананнем усіх тэхнік і працэдур; веданне праграмных патрабаванняў да выбаркі, шкал, розных відаў сацыялагічных даследаванняў (анкетнага апытання, інтэрв'юіравання, фокус-груп, экспертнага апытання і інш.) і прытрымліванне гэтых патрабаванняў пры вырашэнні стандартных задач; дастаткова поўнае засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; самастойная работа на практычных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 6 (шэсць) | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; лагічнае і правільнае выкладанне адказу на пытанні; уменні аналізаваць сацыяльныя з'явы, рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы, добрае валоданне навуковай тэрміналогіяй і інструментарыям дысцыпліны; вырашэнне стандартных задач з выкананнем усіх тэхнік і працэдур; веданне праграмных патрабаванняў да выбаркі, шкал, розных відаў сацыялагічных даследаванняў і прытрымліванне гэтых патрабаванняў пры вырашэнні стандартных задач; прымяненне на добрым узроўні методык колькаснага (статыстычны, нестатыстычны) і якаснага (функцыянальны, структурны, генетычны, сістэмны) аналізу першасных даных, валоданне працэдурай абгрунтавання вынікаў даследавання; поўнае засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | праграмай дысцыпліны; актыўная самастойная работа на практычных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастаткова высокі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 7 (сем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; актыўнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і працэдурных ведаў пры адказе на пытанні і выкананні стандартных задач; лагічнае і правільнае выкладанне адказу на пытанні; уменні аналізаваць сацыяльныя з'явы, рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай; высокі узровень самастойнасці і аналітычнага мыслення пры распрацоўцы метадалагічнага блоку праграмы даследавання, правядзенні вымяральных працэдур (тэарэтычнай аперацыяналізацыі паняццяў, сістэмным аналізе аб'екта даследавання, фарміраванні эмпірычных індыкатараў, шкаліраванні, індэксаванні), абагульненні, колькасным і якасным аналізе вынікаў сацыялагічнага даследавання; актыўная самастойная работа на практычных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 8 (восем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; актыўнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і працэдурных ведаў пры адказе на пытанні і выкананні стандартных і нестандартных навуковых задач; лагічнае і правільнае выкладанне адказу на пытанні; здольнасць да самастойнага даследавання складаных бібліятэказнаўчых праблем з выкарыстаннем сацыялагічных метадаў; якаснае правядзенне шкаліравання, вымяральных працэдур, фарміравання і рамонту выбаркі, пабудовы анкеты (з правільным фармуліраваннем пытанняў розных тыпаў), фарміравання і арганізацыі работы фокус-груп, экспертнага апытання, аналізу эмпірычных даных даследавання з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій; актыўная самастойная работа на практычных занятках, сістэматычны |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 9 (дзевяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і працэдурных ведаў пры адказе на пытанні і выкананні стандартных і нестандартных навуковых задач; выразная здольнасць да самастойнага, творчага і эфектыўнага вырашэння складаных і нестандартных навуковых праблем з выкарыстаннем сацыялагічных метадаў; уменне дакладна вызначыць праблему і забяспечыць правядзенне бібліясацыялагічнага даследавання метадалагічна, метадычна, працэдурна; поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; сістэматычная, актыўная самастойная работа на практычных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях; высокі ўзровень культуры выканання заданняў. |
| 10 (дзесяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы, а таксама па пытаннях, якія выходзяць за яе межы; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і працэдурных ведаў пры адказе на пытанні і выкананні стандартных і нестандартных навуковых задач; выразная здольнасць да самастойнага, творчага і эфектыўнага вырашэння складаных і нестандартных навуковых праблем з выкарыстаннем сацыялагічных метадаў; поўнае і глубокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны, выкарыстанне пры адказе і выкананні практычных заданняў дадатковых крыніц, навуковых дасягненняў іншых дысцыплін; уменне дакладна вызначыць праблему і забяспечыць правядзенне бібліясацыялагічнага даследавання метадалагічна, метадычна, працэдурна; высокі ўзровень абгрунтаванасці, доказальнасці, дакладнасці ўсіх сацыялагічных працэдур і атрыманых вынікаў; сістэматычная, творчая самастойная работа на практычных занятках, актыўны удзел у групавых абмеркаваннях; высокі узровень культуры выканання заданняў. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1. Вучэбная праграма

***Уводзіны***

Прадмет, структура, задачы курса “Сацыялагічныя даследаванні ў бібліятэцы”. Кампетэнцыі, якія набываюць магістранты ў працэсе вывучэння курса. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы. Вучэбна-метадычная забяспечанасць курса.

## РАЗДЗЕЛ І. ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ САЦЫЯЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***Тэма 1. Бібліясацыялогія як міждысцыплінарная галіна ведаў: гісторыя і сучаснасць***

Гісторыя бібліятэказнаўчай сацыялогіі. Тыпалогія бібліясацыялагічных даследаванняў. Сучасныя накірункі сацыялагічных даследаванняў бібліятэчнай дзейнасці. Прымяненне сацыялагічных метадаў для дыягностыкі інфармацыйных патрэб карыстальнікаў бібліятэк; вывучэння чытання; фарміравання і выкарыстання бібліятэчных фондаў; развіцця інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі; арганізацыі і кіравання бібліятэчнай дзейнасцю і інш.

Аб’ект і прадмет бібліятэказнаўчай сацыялогіі. Задачы сацыялагічных даследаванняў у бібліятэках і агульныя патрабаванні да іх.

***Тэма 2. Метадалагічныя асновы сацыялагічных даследаванняў бібліятэчнай дзейнасці***

Метадалагічныя падыходы ў сацыялогіі (паводзінавы і інстытуцыянальны, аб’ектыўна-прадметны і суб’ектыўна-каштоўнасны, функцыяналісцкі і канфліктны), іх узгадненне ў межах канкрэтнага сацыялагічнага даследавання. Бібліятэка як сацыяльная сістэма. Сацыялагічныя веды: сацыяльныя і статыстычныя факты, праблема, гіпотэза, тэорыя. Абгрунтаванасць і дакладнасць сацыялагічных ведаў. Прынцыпы сацыялагічнага даследавання: прычыннасць, дэтэрмінізм, генералізацыя, інварыянтнасць, працэсуальнасць. Прынцыпы бібліятэчнай сацыялогіі:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыякультурнай абумоўленасці; адноснай самастойнасці бібліятэчнай дзейнасці; дыялагічнасці адносін паміж бібліятэкай і карыстальнікамі; індывідуалізацыі.

Метад, тэхніка, методыка і працэдура сацыялагічнага даследавання.

Віды сацыялагічных даследаванняў і асаблівасці іх правядзення. Тэарэтыка-прыкладное і прыкладное даследаванні. Разведвальнае, апісальнае, аналітычнае даследаванні. Кропкавыя і паўторныя даследаванні.

***Тэма 3. Праграма сацыялагічнага даследавання і асноўныя этапы яго правядзення***

Праграма як арганізацыяна-лагічная аснова даследавання.

Тэарэтычны і эмпірычны блокі праграмы. Вызначэнне праблемы, аб’екта і прадмета даследавання. Фармуліраванне мэты і задач даследавання. Удакладненне і інтэрпрэтацыя асноўных паняццяў. Папярэдні сістэмны аналіз аб’екта даследавання. Пераменныя ў сацыялагічным даследаванні. Залежныя і незалежныя пераменныя. Эмпірычная інтэрпрэтацыя пераменных і пабудова паказчыкаў у сацыялагічным даследаванні. Вызначэнне і разгортванне гіпотэз даследавання. Складанне стратэгічнага плана даследавання. Вызначэнне асноўных метадаў і працэдур збора і аналіза зыходных даных.

Асноўныя этапы правядзення бібліясацыялагічнага даследавання: падрыхтоўчы этап, палевыя работы, выніковы этап. Навуковая арганізацыя даследавання як умова атрымання дакладнай і надзейнай інфармацыі.

***Тэма 4. Праграмныя патрабаванні да выбаркі і прынцыпы яе фарміравання***

Паняцце генеральнай і выбарачнай сукупнасці. Рэпрэзентатыўнасць.

Аб’ём выбаркі. Памылка выбаркі. Шкала В.І. Паніётта. Выкарыстанне статыстычнай дакументацыі ў бібліясацыялагічным даследаванні.

Віды выбарак і прынцыпы іх фарміравання. Імавернасныя выбаркі: простая выпадковая выбарка, выпадковая зваротная, выпадковая незваротная, сістэматычная, раяніраваная, стратыфікаваная, гнездавая, шматступенная. Кластерны адбор. Камбінаваны тып выбаркі, яго спецыфіка. Мэтанакіраваныя (невыпадковыя) выбаркі: выбарка даступных выпадкаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адбор тыпавых выпадкаў, квотная выбарка, метад асноўнага масіву, метад стыхійнага адбору.

Тыпавыя памылкі пры фарміраванні выбаркі і спосабы яе карэкцыі.

### *Тэма 5. Вымярэнне сацыялагічных характарыстык аб'екта*

Паняцце вымярэння ў сацыялогіі. Вымяральная працэдура: тэарэтычная аперацыяналізацыя паняццяў, фарміраванне эмпірычных індыкатараў, шкаліраванне, аналіз даных. Прамое і ўскоснае вымярэнне. Метады прамога вымярэння: кадаванне, вербальная ацэнка рэспандэнтам уласцівасцей аб'екта, колькасная ацэнка ўласцівасцей аб'екта, графічная ацэнка ўласцівасцей, метад індэксаў, ранжыраванне, метад парных параўнанняў, метад інтэрвалаў. Ускоснае вымярэнне і метады яго рэалізацыі: групіроўка значэнняў пераменных, пабудова індэксаў, шкаліраванне.

Асноўныя тыпы і віды шкал. Вербальныя, лічбавыя, графічныя шкалы. Віды шкал па зместу і  прызначэнню: намінальная, парадкавая, інтэрвальная, шкала для вымярэння ўстановак і адносін, ацэначная, метрычная. Асаблівасці аднамернага шкаліравання. Кадаванне, яго віды. Ранжыраванне. Метад парных параўнанняў. Метад Луі Перстоуна. Шкала Рэнсіса Лэйкерта. Шкала Луі Гутмана. Асноўныя патрабаванні да шкал: валіднасць, паўната, адчувальнасць, рэлевантнасць, дакладнасць, надзейнасць.

## РАЗДЗЕЛ II. АРГАНІЗАЦЫЯ І МЕТОДЫКА ПРАВЯДЗЕННЯ САЦЫЯЛАГІЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

### *Тэма 6. Класіфікацыя метадаў збора сацыялагічнай інфармацыі і асаблівасці іх вакарыстання ў бібліятэказнаўстве*

Колькасныя і якасныя метады збора даных, іх магчымасці і абмежаванні. Сістэма збора даных: даследаванні манаграфічныя, суцэльныя, выбарачныя.

Неапытальныя метады збора першасных даных. Прамое назіранне. Перавагі і недахопы метаду назірання. Спецыфіка бібліясацыялагічнага назірання. Віды назірання і асаблівасці рэалізацыі метаду ў бібліятэцы. Характарыстыка структуры назіраемай сітуацыі. Вызначэнне параметраў назіраемай сітуацыі. Выбар адзінак назірання. Праблема суб'ектыўнасці назірання і спосабы павышэння надзейнасці метаду. Аналіз дакументных крыніц: класічны і фармалізаваны метады, асаблівасці іх выкарыстання ў

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКМ

бібліятэказнаўчых даследаваннях. Метад сацыялагічнага эксперыменту, віды, магчымасці выкарыстання для даследавання бібліятэказнаўчых з’яў. Лагічная структура эксперыменту. Патрабаванні да правядзення эксперыменту.

Апытальныя метады: анкетаванне, інтэрв’ю, фокус-групы, экспертнае апытанне.

### *Тэма 7. Методыка правядзення анкетнага апытання*

Спецыфіка анкетавання. Пазнавальныя магчымасці анкетнага пытання. Функцыі анкетнага пытання. Лагічная структура пытання. Віды анкетных пытанняў па ступені стандартызацыі (закрытыя, напаўзакрытыя і адкрытыя); па канструктыўных асаблівасцях (дыхатамічныя, альтэрнатыўныя, паліварыянтныя); па функцыях (фільтры, кантрольныя, пасткі). Складаныя пытанні. Асноўныя правілы фармуліроўкі пытанняў. Узаемасувязь анкетных пытанняў і колькасці рэспандэнтаў.

Агульная кампазіцыя анкеты. Уступная, базісная і заключная часткі анкеты. Прынцыпы кампазіцыі анкеты. Дадатковыя раздзелы анкеты. Правілы кадавання. Метадычныя патрабаванні да анкеты. Распрацоўка анкеты. Працэдура лагічнага аналізу анкеты: адпаведнасць лагічным і сацыяльна-псіхалагічным крытэрам. Стварэнне і апрабіраванне анкеты ў сетцы Інтэрнэт.

Неабходныя ўмовы арганізацыі і паспяховага прымянення анкетавання. Паняцце пілатажнага даследавання. Тэхніка распаўсюджання і збора анкет. Апрацоўка і інтэрпрэтацыя даных, спосабы карэкцыі.

### *Тэма 8. Методыка інтэрв’ю. Выкарыстанне метаду фокус-груп у сацыялагічных даследаваннях бібліятэчнай дзейнасці*

Вызначэнне і спецыфіка інтэрв’ю, перавагі і недахопы метаду. Тыпалогія інтэрв’ю. Фармалізаванае, напаўфармалізаванае, нефармалізаванае інтэрв’ю. Этапы падрыхтоўкі і правядзення інтэрв’ю. Інтэрв’ю як працэс сацыяльна-псіхалагічнага ўзаемадзеяння інтэрв’юрэра з рэспандэнтам. Цяжкасці прымянення інтэрв’ю. “Эфект інтэрв’юрэра”, спосабы мінімізацыі. Асаблівасці фіксавання, апрацоўкі і аналіза інфармацыі, атрыманай метадам інтэрв’ю.

Фокус-група, вызначэнне і сфера прымянення метаду. Асноўныя прынцыпы факусіраванага глыбіннага інтэрв’ю. Фарміраванне фокус-груп.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Склад і колькасць удзельнікаў фокус-груп, абмежаванні на удзел. Арганізацыя правядзення фокус-груп. Функцыі мадэратара. Работа фокус-групы. Кіраванне групавым працэсам. Аналіз вынікаў работы фокус-групы. Кантэнт-аналіз. Метад міжгрупавых параўнанняў. Дыскурс-аналіз. Абмежаванні і сфера прымяненне метаду фокус-груп.

### *Тэма 9. Экспертнае апытанне ў даследаванні бібліятэказнаўчых працэсаў і з'яў*

Апытанне экспертаў як метад збора сацыялагічнай інфармацыі. Умовы прымянення экспертнага апытання. Мэты, рэалізуемыя пры дапамозе метаду экспертных адзнак у бібліятэказнаўчым даследаванні. Віды экспертнага апытання. Асноўныя стадыі правядзення экспертных апытанняў. Адбор экспертаў: пошук патэнцыяльных экспертаў, ацэнка кампетэнтнасці экспертаў, вызначэнне колькасці экспертных груп. Праблема вымярэння: патрабаванні да шкал меркаванняў экспертаў. Мадэлі паводзінаў экспертаў.

Этап збора экспертнай інфармацыі, яго працэдурныя асаблівасці. Перавагі працэдур са зваротнай сувяззю без непасрэднага ўзаемадзеяння экспертаў. Метад Дэльфі. Метад якаснай зваротнай сувязі. Метад індывідуальнай зваротнай сувязі. Фактары валіднасці экспертных ацэнак. Памылкі і цяжкасці ў прымяненні экспертнага апытання. Метады апрацоўкі экспертных меркаванняў.

### *Тэма 10. Абагульненне і аналіз вынікаў сацыялагічнага даследавання*

Віды аналіза даных, якія выкарыстоўваюцца ў бібліясацыялагічным даследаванні. Разнавіднасці колькаснага (статыстычны, нестатыстычны) і якаснага (функцыянальны, структурны, генетычны, сістэмны) аналізу. Этапы і працэдуры першаснага аналізу анкетных даных. Праграмнае забеспячэнне камп'ютэрнай апрацоўкі сацыялагічнай інфармацыі.

Статыстычныя метады апрацоўкі і аналіза даных. Пабудова варыяцыйных шэрагаў, групіроўка даных. Пошук узаемасувязяў паміж зменнымі велічынямі. Частотнае размеркаванне: таблічнае прадстаўленне, віды частот, графічнае размеркаванне. Колькасныя характарыстыкі масіва даных. Нестатыстычныя метады апрацоўкі і аналізу даных: табліцы спалучэнняў, метады візуалізацыі, аналіз тэкставых даных, адкрытых пытанняў, латэнтна-структурны аналіз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мнагамерны аналіз сацыялагічнай інфармацыі: дыскрымінантны, кластэрны, фактарны. Адбор найбольш інфарматыўных прымет. Аналіз даных, вымераных па парадкавых і намінальных шкалах. Працэдура абгрунтавання вынікаў даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2. ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя Заняткі | | |
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* |
| 1 | Уводзіны | 0,5 | | | | | |
| | **Раздзел І. Тэарэтыка-метадалагічныя асновы сацыялагічных даследаванняў бібліятэчнай дзейнасці** | | | | | | |
| 2 | ***Тэма 1.*** Бібліясацыялогія як міждысцыплінарная галіна ведаў: гісторыя і сучаснасць | 0,5 | | | | 6 | Праблемныя заданні, групавыя абмеркаванні |
| 3 | ***Тэма 2.*** Метадалагічныя асновы сацыялагічных даследаванняў бібліятэчнай дзейнасці | 1 | | | | 4 | Прэзентацыі, праблемныя і тэставыя заданні |
| 4 | ***Тэма 3.*** Праграма сацыялагічнага даследавання і асноўныя этапы яго правядзення | 1 | | 2 | | 4 | Даследчыя заданні, групавыя абмеркаванні |
| 5 | ***Тэма 4.*** Праграмныя патрабаванні да выбаркі і прынцыпы яе фарміравання | 1 | | | | 4 | Аналіз і распрацоўка выбарак даследаванняў |
| | ***Тэма 5.*** Вымярэнне сацыялагічных характарыстык аб’екта | 1 | | | | 10 | Аналіз і распрацоўка даследчых шкал |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Раздзел ІІ. Арганізацыя і методыка правядзення сацыялагічнага даследавання ў бібліятэцы** | | | | | | |
| 6 | ***Тэма 6.*** Класіфікацыя метадаў збора сацыялагічнай інфармацыі і асаблівасці іх вакарыстання ў бібліятэказнаўстве | 1 | | | | 2 | Групавыя абмеркаванні, распрацоўка метадычных матэрыялаў |
| 7 | ***Тэма 7.*** Методыка правядзення анкетнага апытання | 1 | | 2 | | 12 | Групавыя абмеркаванні, распрацоўка розных відаў анкет |
| 8 | ***Тэма 8.*** Методыка інтэрв'ю. Выкарыстанне метаду фокус-груп у сацыялагічных даследаваннях бібліятэчнай дзейнасці | 1 | | 2 | | | Аналіз бланкаў інтэрв'ю, правядзенне даследчага інтэрв'ю |
| | ***Тэма 9.*** Экспертнае апытанне ў даследаванні бібліятэказнаўчых працэсаў і з'яў | 1 | | 2 | | 4 | Распрацоўка анкет для экспертнага апытання |
| | ***Тэма 10.*** Абагульненне і аналіз вынікаў сацыялагічнага даследавання | 2 | | | | | Падрыхтоўка прэзентацый, нагляднага матэрыялу і справаздач па выніках даследавання |
| | **Усяго** | **12** | **-** | **8** | **-** | **46** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5.3. АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Брофи, Питер. Оценка деятельности библиотек: принципы и методы / Питер Брофи ; науч. ред. пер. Я.Л. Шрайберг. – Москва : Омега-Л, 2009. – 357 с.

2. Бабосов, Е. М. Стратегия, программа и методы социологического исследования // Бабосов, Е. М. Общая социология : учебное пособие. – 2-е изд., стер. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – С. 518–538.

3. Васильев, И. Г. Социологические исследования в библиотеках : практическое пособие / И. Г. Васильев, М. Е. Илле, Д. К. Равинский . – Санкт-Петербург : Профессия, 2001. – 176 с.

4. Добреньков, В. И Методы социологического исследования : учебник по специальности 020300 «Социология» / В. И. Добреньков, А. И. Кравченко. – Москва : Инфра-М, 2009. – 767 с.

5. Качанова, Е. Ю. Исследовательская деятельность библиотек: назначение, теоретические основы, технология : учебно-практическое пособие / Качанова Елена Юрьевна ; М-во культуры Российской Федерации, ФГБОУ ВО «Хабаровский гос. ин-т культуры». – Хабаровск : Хабаровский гос. ин-т культуры, 2016. – 80 с.

6. Крейденко, В. С. Библиотечные исследования : учебно-методическое пособие / В. С. Крейденко. – Москва : Русская школьная библиотечная ассоциация, 2007. – 351 с.

7. Самохина, М. М. Социолог в библиотеке, или Библиотекарь как социолог : практ. пособие / М. М. Самохина. – Москва: Рос. гос. юношес. б-ка, 2008. – 194 с.

8. Стефановская, Н. А. Социологические исследования чтения: теория, методика, практика : научно-практическое пособие / Н. А. Стефановская. - Москва : Литера, 2013. – 143 с.

9. Социологические исследования в библиотеке: подготовка, организация, проведение [Электронный ресурс] / Национальная библиотека Беларуси ; сост. О. В. Бондарчук, А. С. Дубина, К. О. Францкевич ; ред.: М. Г. Пшыбытко и др. – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2018. – 1 электронный оптический диск (CD-ROM). – (БиблиоКонсультант).

10. Тавокин, Е. П. Основы методики социологического исследования / Е. П. Тавокин : учебное пособие для высших учебных заведений по специальности 040201 «Социология». – Москва : Инфра-М, 2009. – 236 с.

11. Ядов, В. А. Стратегия социологического исследования: Описание, объяснение, понимание социальной реальности : учебное пособие / В. А.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ядов в сотрудничестве с В. В. Семеновой. – Москва : Академкнига : Добросвет, 2003. – 595 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.4. ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Горшков, М. К. Прикладная социология: методология и методы : учебное пособие / М. К. Горшков, Ф. Э. Шереги. – Москва : Альфа-М, 2009. – 414 с.

2. Готлиб, А. С. Введение в социологическое исследование. Качественный и количественный подходы. Методология. Исследовательские практики : учебное пособие / А. С. Готлиб. – Москва : Флинта, 2005. – 382 с.

3. Гуц, А. К. Математические методы в социологии / А. К. Гуц, Ю. В. Фролова. – Москва : Изд-во ЛКИ, 2007. – 216 с.

4. Девятко, И. Ф. Методы социологического исследования : учебное пособие: для высших учебных заведений по специальности 040201 «Социология» и 040102 «Социальная антропология» / И. Ф. Девятко. – Москва : Книжный дом, 2006. – 293 с.

5. Кротюк, Н. И. Белорусская книга и ее читатель. Опыт социологического исследования / Респ. правление Бел. о-ва "Книга". – Минск, 1990. – 52 с.

6. Кузнецов, И. Н. Технологии социологического исследования : учебно-методическое пособие / И.Н. Кузнецов. – Москва : МарТ, 2005. – 142 с.

7. Кулаков, П. А. Измерение в социологии : учебное пособие / П. А. Кулаков. – Новосибирск, НГАСУ, 2005. – 124 с.

8. Макеева, О. В. Социологические методы изучения пользователей: история и современное состояние / О. В. Макеева // Труды ГПНТБ СО РАН. – 2016. – № 10. – С. 272-281.

9. Мельникова, О. Т. Фокус-группы: методы, методология, модерирование : учебное пособие. – Москва : АспектПресс, 2007. – 318 с.

10. Методика эмпирического социологического исследования : метод. разраб. / Витеб. гос. технол. ун-т ; [сост. Е.И. Мальченков]. – Витебск : ВГТУ, 1999. – 45 с.

11. Осипов, Г. В. Методы измерения в социологии / Г. В. Осипов. – Москва : Наука, 2003. – 106 с.

12. Проведение маркетинговых и социологических исследований в учреждениях культуры : (методические рекомендации) / Кировская гос. унив. обл. науч. б-ка им. А. И. Герцена, Науч.-методический отд. ; [сост. Н.А. Скрябина]. – Киров : Кировская гос. унив. обл. науч. б-ка им. А.И. Герцена, 2010. – 55 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. Смехнова, Г. П. Основы прикладной социологии : учебное пособие / Г. П. Смехнова. – Москва : Вузовский учебник, 2012. – 252 с.

14. Тавокин, Е. П. Основы методики социологического исследования : учебное пособие / Е. П. Тавокин. – Москва : Инфра-М, 2017. — 239 с.

15. Трофимова, Р. А. Библиосоциология : История, теории, методология, исследовательские методы : автореферат дис. ... доктора социологических наук : 22.00.01 / Р. А. Трофимова ; Алт. гос. ун-т. – Барнаул, 2002. – 34 с.

16. Толстова, Ю. Н. Измерение в социологии : учебное пособие / Ю. Н. Толстова. – Москва: Университет, 2009. – 291 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ